НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ,
МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

УДК 821.161.3.09

**МЕЛЬНІКАВА**
**Анжэла Мікалаеўна**

# КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА Ў БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ ХХ СТАГОДДЗЯ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

**Мінск, 2017**

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

**Навуковы кансультант:** **Штэйнер Іван Фёдаравіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»

**Афіцыйныя апаненты**: **Гарадніцкі Яўген Андрэевіч**, доктар філалагічных навук, намеснік дырэктара па навуковай рабоце філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі»

**Макарэвіч Аляксандр Мікалаевіч**, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»

**Тычко Галіна Казіміраўна**,
доктар філалагічных навук, прафесар кафедры медыялогіі і вэб-журналістыкі Інстытута журналістыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт»

**Апаніруючая арганізацыя:** установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»

Абарона адбудзецца “31” студзеня 2018 г. а 14$^{00}$ на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.04 пры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, e-mail: inlinasbel@tut.by; тэл.: 284-18-85).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 15).
Аўтарэферат разасланы ___ снежня 2017 года.

Вучоны сакратар савета Д 01.42.04
кандыдат філалагічных навук А.У. Бразгуноў

Мастацкая літаратура – цэласны эстэтычны феномен, які мае сваю непаўторную адметнасць, сфарміраваную спецыфікай гістарычнага развіцця нацыі, яе псіхалогіяй, менталітэтам. Гэта адна з галоўных формаў духоўнага самавыяўлення народа, пэўная сістэма нацыяпазнання. Прыгожае пісьменства фармулюе, захоўвае і рэтранслюе нацыянальныя светапоглядныя, маральныя, эстэтычныя, сацыяльныя каштоўнасці, нацыянальны культурны код. Магістральнымі напрамкамі ў гісторыі нашай літаратуры былі ўсведамленне і сцвярджэнне самабытнасці беларускай нацыі, выпрацоўка канцэпцыі нацыянальнага шляху, вербалізацыя поглядаў беларуса на свет і чалавека.

Знакавым у развіцці беларускага мастацтва слова з’яўляецца перыяд першай трэці ХХ стагоддзя, які характарызуецца інтэнсіўнымі інтэлектуальнымі, мастацкімі пошукамі, значнымі творчымі адкрыццямі, істотным узмацненнем філасофскага гучання літаратуры. У першай трэці ХХ стагоддзя адбываюцца працэсы самаарганізацыі беларускай літаратуры як сістэмы, афармляецца пэўная мадэль нацыянальнага прыгожага пісьменства: ідэйна-эстэтычныя прынцыпы, літаратурна-мастацкія арыенціры, светапоглядная канцэпцыя, маральна-этычныя каштоўнасці. Складваюцца этнапаэтыка, нацыянальная семіясфера, нацыянальны міф, адбываецца станаўленне нацыянальнага класічнага стылю. Выпрацоўваецца сістэма інфармацыйных кодаў унутры нацыянальнай культуры.

Вызначальныя інтэнцыі нацыянальнага прыгожага пісьменства першай трэці ХХ стагоддзя – сцвердзіць Беларусь і беларускасць, агучыць нацыянальныя маральныя і светапоглядныя каштоўнасці.

Актуальным для літаратуразнаўства з’яўляецца сістэмнае даследаванне спецыфікі канцэптуалізацыі нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя, на вырашальным этапе нацыянальнага самаўсведамлення. Названая праблема не выступала прадметам комплекснага навуковага аналізу.

Зварот да праблем нацыянальнага абумоўлены і сучаснай сацыякультурнай сітуацыяй, узмацненнем працэсаў глабалізацыі, што з асаблівай вастрынёй паставіла пытанне захавання нацыянальнага культурнага коду.

Пераасэнсавання гісторыі нацыянальнага прыгожага пісьменства патрабуе і неабходнасць звароту да новых метадалагічных падыходаў у гуманітарных даследаваннях.

Такім чынам, наша работа накіравана на стварэнне больш цэласнай і поўнай карціны гісторыка-літаратурнага працэсу першай трэці ХХ стагоддзя з актуалізацыяй нацыянальных філасофска-этычных асноў мастацкай рэфлексіі.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Работа выканана на кафедры беларускай літаратуры ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны».

Тэма дысертацыйнага даследавання «Нацыянальна-светапоглядныя каардынаты беларускай літаратуры першай трэці ХХ стагоддзя» была зацверджана рашэннем Савета філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» (пратакол № 4 ад 22.12.2014), скарэктавана навукова-тэарэтычным семінарам «Актуальныя праблемы беларускага літаратуразнаўства» філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ў фармуліроўцы «Канцэптуалізацыя нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя» з мэтай больш дакладнага адлюстравання зместу (пратакол № 1 ад 17.05.2017).

Дысертацыйная работа выконвалася адпаведна заданню «Дыялектыка нацыянальнага і агульначалавечага ў беларускай і славянскіх літаратурах: праблемы ідэнтычнасці і працэсы культурна-цывілізацыйнага ўзаемадзеяння» (№ дзяржрэгістрацыі 20111168) дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава»; падпраграма 4 «Беларуская мова і літаратура». Асобныя аспекты работы распрацаваны ў рамках планавага задання на 2006–2010 гг. «Літаратура і духоўна-гістарычны вопыт беларускага народа і славянскія традыцыі» (№ дзяржрэгістрацыі 20072251) дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў «Беларуская мова і літаратура ў гістарычным развіцці і сучасным грамадстве, іх сувязі і ўзаемадзеянне з іншымі мовамі і сусветным літаратурна-мастацкім працэсам» (ДПФД «Беларуская мова і літаратура»), планавага задання на 2001–2005 гг. «Жанравая сістэма беларускай літаратуры ХХ стагоддзя і еўрапейскія традыцыі» (№ дзяржрэгістрацыі 20012100) дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў «Беларуская мова і літаратура».

**Мэта і задачы даследавання. Мэта** – цэласна, сістэмна акрэсліць спецыфіку канцэптуалізацыі нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя: праблему нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, асаблівасці мастацкага асэнсавання ключавых пытанняў тут-быцця нацыі, нацыянальную адметнасць ідэйных і этычных асноў творчасці беларускіх пісьменнікаў, спецыфіку нацыянальнага менталітэту, канцэпцыю нацыянальнага шляху, сфармуляваную ў мастацкіх, публіцыстычных, крытычных тэкстах.

У адпаведнасці з абранай мэтай ставяцца наступныя **задачы:**

- выявіць формы мастацкай рэалізацыі нацыянальнага;

- ахарактарызаваць напрамкі асэнсавання нацыянальнага навукова-тэарэтычнай і публіцыстычнай думкай пачатку XX стагоддзя;

- акрэсліць спецыфіку эстэтычнай мадэлі нацыянальнага быцця ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя праз вызначэнне структуры мастацкага аўтавобраза Беларусі, разгляд вобраза «Іншага», станаўлення беларуса як суб’екта гісторыі;

- раскрыць сутнасць мастацка-эстэтычнай канцэпцыі нацыянальнага светапогляду, адлюстраванага ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя;

- устанавіць спецыфіку мастацка-вобразнай сістэмы беларускай прозы першай трэці XX стагоддзя;

- вызначыць змест мастацкай гістарыясофіі беларускай прозы;

- ахарактарызаваць сутнасць канцэпцыі чалавека ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя, адметнасці яе мастацкага ўвасаблення на ідэйна-тэматычным і стылёвым узроўнях.

**Аб’ект і прадмет даследавання.** *Аб’ектам* даследавання з’яўляюцца творы беларускай прозы першай трэці XX стагоддзя – Якуба Коласа, Вацлава Ластоўскага, Максіма Гарэцкага, Максіма Багдановіча, Кузьмы Чорнага, Змітрака Бядулі, Міхася Зарэцкага, Лукаша Калюгі, Міхася Лынькова і інш. Мы таксама звяртаемся да твораў Кузьмы Чорнага 1940-х гадоў, паколькі змястоўна яны адпавядаюць пошукам беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя. *Прадмет* даследавання – вектары актуалізацыі нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя, спецыфіка мастацкага аўтавобраза Беларусі, мастацка-эстэтычнай канцэпцыі нацыянальнага светапогляду, нацыянальна-этычныя асновы творчасці беларускіх пісьменнікаў, мастацкая гістарыясофія беларускай прозы, канцэпцыя чалавека.

**Навуковая навізна.** На аснове цэласнага культуралагічнага аналізу мастацкіх і літаратурна-крытычных тэкстаў ***упершыню*** сістэмна апісана нацыянальная спецыфіка беларускай прозы першай трэці XX стагоддзя:

- праведзены комплексны аналіз публіцыстыкі і літаратурнай крытыкі пачатку XX ст. на прадмет самаўсведамлення беларускімі літаратарамі нацыянальнай адметнасці, канцэптуалізацыі нацыянальнага;

- цэласна ахарактарызавана эстэтычная мастацкая мадэль нацыянальнага быцця ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя: вызначана структура мастацкага аўтавобраза Беларусі, разгледжаны вобраз «Іншага», даследавана адлюстраванне літаратурай працэсу станаўлення беларуса як суб’екта гісторыі;

- асэнсавана спецыфіка мастацкага засваення нацыянальнага светапогляду;

- разгледжаны гістарыясофскія асновы творчасці беларускіх пісьменнікаў

першай трэці XX стагоддзя;

- сістэмна даследавана канцэпцыя чалавека ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя і мастацкая спецыфіка яе рэалізацыі.

Работа дазваляе зрабіць больш дакладныя высновы адносна спецыфікі гісторыка-літаратурнага працэсу першай трэці XX стагоддзя, канкрэтызаваць пэўныя палажэнні літаратуразнаўства.

**Практычнае значэнне:** матэрыялы і вывады дысертацыі актуальныя для далейшых тэарэтычных і навукова-практычных даследаванняў нацыянальнага прыгожага пісьменства.

Вынікі працы служаць абнаўленню напрамкаў вывучэння літаратуры, пашыраюць праблемны дыяпазон даследаванняў беларускага мастацтва слова, паглыбляюць разуменне асноўных тэндэнцый развіцця айчыннага прыгожага пісьменства, эстэтычных асаблівасцей літаратурнага працэсу першай трэці XX стагоддзя.

Перспектывы далейшага даследавання праблем спецыфікі нацыянальнай самабытнасці беларускай літаратуры заключаюцца як у сінхранічным аспекце – праз пашырэнне кола аўтараў, так і ў дыяхранічным – праз вывучэнне названай праблемы ў іншыя культурна-гістарычныя эпохі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

1. Нацыянальнае ў мастацкай літаратуры характарызуецца шматаспектнасцю форм рэпрэзентацыі. Носьбітам пэўных нацыянальна-псіхічных канстант, менталітэту выступае як герой твора, так і сам аўтар, які заўсёды (усвядомлена ці падсвядома) мадэлюе мастацкую рэальнасць праз прызму нацыянальнага. Спецыфіка нацыянальнага выяўляецца як у змесце твора, яго ідэйным гучанні, аксіялагічным патэнцыяле, так і праз форму, сістэму мастацкіх сродкаў і прыёмаў, нацыянальную канцэптасферу, топіку, сімвалічныя вобразы, мастацкую дэталь, нацыянальны тып героя. Адметнасць асобнай нацыянальнай літаратуры як цэласнага феномена вызначае таксама сістэма ўстойлівых матываў, міфалагем, архетыпаў. Своеасаблівасць мастацкіх прасторы і часу перадаецца праз пэўныя этнакультурныя канстанты.

2. Змест паняцця беларускасці акрэсліваўся як мастацкімі тэкстамі, так і навукова-крытычнай думкай, публіцыстыкай. У навукова-тэарэтычнай і публіцыстычнай думцы пачатку XX стагоддзя сцвярджаецца нацыянальная дадзенасць беларускага народа, яго часава-прасторавая ўкарэненасць, самабытнасць беларускай нацыі, замацоўваецца тэзіс пра высокі ўзровень развіцця беларускай культуры ў мінулым, складваецца пантэон гістарычных і культурных дзеячаў, фарміруецца міф паходжання. Цывілізацыйны код Беларусі акрэсліваецца як еўрапейскі. Абгрунтоўваецца ідэя нацыянальнай незалежнасці, а

таксама ідэя ўзаемасувязі нацыянальнага адраджэння і сацыяльнага вызвалення беларуса.

3. Беларускай прозай першай трэці XX стагоддзя эстэтычна асэнсавана спецыфіка нацыянальнага быцця. Канстытуцыйнымі кампанентамі мастацкага аўтавобраза Беларусі з'яўляюцца канкрэтная тэрыторыя, якую вылучаюць пэўныя ландшафтныя і тапанімічныя адзнакі, геаграфічныя межы, гістарычныя і культурныя персаналіі, спецыфіка побыту і светапогляду. Беларусь у мастацкіх творах першай трэці XX стагоддзя паўстае як краіна шматэтнічная і поліканфесійная. Паказальным у мастацкім аўтавобразе Беларусі выступае канцэпцыя памежнага становішча. Адначасова з міфам пра велічнае мінулае фарміруецца міф пакутаў. Вобраз беларуса амбівалентны: побач з вобразам беларуса-пакутніка замацоўваецца вобраз беларуса як самастойнага і самадастатковага суб'екта гісторыі.

4. У творах беларускіх пісьменнікаў першай трэці XX стагоддзя пададзена завершаная карціна нацыянальнага свету, адлюстраваны ключавыя адзнакі беларускага этнасу, нацыянальны светапогляд, маральна-этычныя каштоўнасці, увасоблены ідэал гарманічнага ўніверсуму, кодэкс нацыянальнай этыкі. У літаратуры выяўлены такія рысы нацыянальнага светапогляду, як вітальнасць, жыццёвасць, прывязанасць да «свайго» (сваёй сям'і, зямлі, малой радзімы), нявыхад за межы ўласнай тоеснасці, перавага рацыянальнага над эмацыянальным, талерантнасць, антэізм (параднёнасць з роднай зямлёй), эстэтызм мыслення. У канцэпцыі беларускіх пісьменнікаў свая зямля, свой дом складаюць ідэал гарманічнага ўніверсуму.

5. Спецыфіку ідэйнай і мастацка-вобразнай сістэмы беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя як цэласнага эстэтычнага феномена складаюць вобразы «роднага кута», зямлі, дому, якія гістарычна сфарміраваліся ў кантэксце нацыянальнай культуры. Гэтыя вобразы дазваляюць спасцігнуць заканамернасці мастацкага функцыянавання глыбінных нацыянальна-анталагічных пластоў, перадаюць нацыянальна-культурную адметнасць. Сэнсава-значным для літаратуры пачатку XX стагоддзя з'ўляецца вобраз «забранага краю», «раскіданага гнязда». Мастацкая прастора твораў беларускай прозы першай трэці XX стагоддзя, як правіла, лакальна абмежаваная, аднак у лакальным увасабляецца агульназначнае.

6. Глыбіня і маштабнасць праблем, узнятых беларускай прозай 1910–40-х гадоў, дазваляе гаварыць пра яе гістарыясофскі ўзровень. Канцэптуальнай адзнакай мастацкай гістарыясофіі беларускай прозы выступае яе нацыясофская скіраванасць. У беларускай прозе 1910–40-х асэнсоўваюцца ключавыя моманты нацыянальнага быцця, лёс нацыі ў мінулым і сучасным, актуальнейшыя падзеі

часу: Першая і Другая сусветная вайна, рэвалюцыі, падзел і ўз'яднанне Беларусі. Акцэнтуецца ўвага на трагічным характары беларускай гісторыі. Беларуская проза спрабуе спасцігнуць заканамернасці гістарычнага працэсу ўвогуле, аб'ектыўны сэнс гістарычных падзей першай паловы XX стагоддзя, іх духоўна-маральны аспект. Беларуская літаратура прапанавала ўласную мастацка-светапоглядную канцэпцыю эпохі.

7. У беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя пададзена стройная канцэпцыя чалавека, абумоўленая як сістэмай поглядаў саміх аўтараў, так і культурна-гістарычным і духоўным кантэкстам сучаснасці, нацыянальнай этычнай сістэмай. У эпоху дэфармацыйных зрухаў літаратура сцвярджае каштоўнасць чалавека як у філасофскім плане, так і ў сацыяльным. Беларускай літаратурай першай трэці XX стагоддзя створаны вобраз дзейснай асобы, здольнай абараняць свае прынцыпы і ідэалы. Пэўныя погляды на чалавека прадвызначылі спецыфіку іх мастацкага ўвасаблення на ідэйна-тэматычным і стылёвым узроўнях.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Дысертацыя ўяўляе сабой самастойнае навуковае даследаванне. Публікацыі па тэме работы напісаны без сааўтараў і адлюстроўваюць асабісты ўклад саіскальніка ў вывучэнне гісторыі беларускай літаратуры XX ст.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Даклады і паведамленні па тэме дысертацыйнай працы былі зроблены на **Міжнародных кангрэсах**: XV Міжнародным з'ездзе славістаў (Мінск, 20–27 жніўня 2013); на III Міжнародным кангрэсе беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21-25 мая 2000), IV Міжнародным кангрэсе беларусістаў «Беларуская культура ў кантэксце культур еўрапейскіх краін» (Мінск, 6-9 чэрвеня 2005), III, IV, V Міжнародных кангрэсах даследчыкаў Беларусі (Каўнас, 2013, 2014, 2015), на Міжнародным навуковым кангрэсе беларускай культуры (Мінск, 5–6 мая 2016); на **Міжнародных навуковых канферэнцыях:** «Dziedzictwo przeszłości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-słowiańskich» (Беласток, 2000); VIII Міжнародных навуковых чытаннях, прысвечаных С. Некрашэвічу (Гомель, 2007); міжнародных навуковых канферэнцыях «Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах» (Гомель, 2008, 2010, 2012, 2014, 2016); міжнародных навуковых канферэнцыях «Гарэцкія чытанні» (Мінск, 1997, 2000); IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай» (Мінск, 2000); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Скарына і наш час» (Гомель, 2002); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Текст в лингвистической теории и методике преподавания филологических дисциплин» (Мазыр, 2003); міжнароднай

навуковай канферэнцыі «Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся» (Гомель, 2004); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Рэгіянальныя асаблівасці фальклору і літаратуры славянскіх народаў» (Гомель, 2004); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Таленавітыя жанчыны Беларусі ў культурнай, навуковай і мастацкай прасторы свету» (Мазыр, 2007); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Діалог слов’янських культур» (Нікалаеў, 2008); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Христианский гуманизм и его традиции в славянской культуре» (Гомель, 2009); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Сёмыя Танкаўскія чытанні» (Мінск, 2009), міжнароднай навуковай канферэнцыі «Мастацкі свет Максіма Багдановіча: адметнасць, шматграннасць, універсальнасць» (Мінск, 2011), міжнароднай навуковай канферэнцыі «Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры» (Мінск, 2011); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Периферійны та місцеві ідентичності в літературі» (Нікалаеў, 2011), міжнароднай навуковай канферэнцыі «Імагологічна проблематика польської, білоруської, російскої літератур і європейській контекст» (Луцк, 2011), міжнароднай навуковай канферэнцыі «Язык-литература-культура в контексте национальных взаимосвязей» (Бярдзянск, 2011), міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская і руская літаратуры: тыпалогія ўзаемасувязей і нацыянальнай ідэнтыфікацыі» (Мінск, 2012); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе. Проблемы теоретической и исторической поэтики» (Гродна, 2012, 2014), міжнароднай навуковай канферэнцыі «Творчасць Аркадзя Куляшова ў дыялогу славянскіх літаратур: традыцыі, наватарства, нацыянальная адметнасць» (Мінск, 2014); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Формирование и развитие национального самосознания в отражении белорусской, русской и зарубежных литератур» (Полацк, 2015), міжнароднай навуковай канферэнцыі «Запечатленная Победа: ключевые образы, концепты, идеологемы» (Санкт-Пецярбург, 2015); міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства» (Мінск, 2016), міжнароднай навуковай канферэнцыі «Topos domu w literaturach wschodniosłowiańskich» (Беласток, 2016); **на рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях**: «Слово и время» (Гомель, 2002, 2003, 2006); на Трэціх навуковых чытаннях, прысвечаных С. Некрашэвічу (Гомель, 1997); «Алесь Адамовіч і час» (Мінск, 1997); «Каласавіны» (1997, 1998, 1999, 2003, 2006); «Канцэптуальныя пытанні развіцця мовы, літаратуры і мастацтва ў святле адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа» (Мазыр, 1998); «Духоўная і культурная спадчына Беларускага Палесся» (Гомель, 1997); «Мова і літаратура ў сярэдняй і вышэйшай школе. Актуальныя праблемы выкладання» (Гродна, 2000); «Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага

працэсу» (Мінск, 2004); «Выяўленча-мастацкія, арганізацыйныя і ідэалагічныя праблемы сучаснай беларускай літаратуры ў яе сувязях з грамадскімі практыкамі» (Мінск, 2009); «Вечны рух жыцця і заканамернасці творчых пошукаў літаратуры» (Мінск, 2015); на ўсеўкраінскай навуковай канферэнцыі «Література на пограниччі: амбівалентність, гібридність, долання кордонів» (Львоў, 2012).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 77 публікацыях, сярод якіх 2 манаграфіі, 1 зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў, 2 праграмы, 1 курс лекцый, 71 навуковы артыкул (сярод іх 23 надрукаваны ў рэкамендаваных ВАК і замежных навуковых выданнях, 16 – у зборніках навуковых прац, 32 – у матэрыялах канферэнцый). Агульны аб’ём публікацый па тэме дысертацыі, якія адпавядаюць пункту 18 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь, складае 41,2 аўт. арк., агульны аб’ём іншых публікацый – 30, 3 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, шасці раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса (389 адзінак, з іх спіс выкарыстаных крыніц змяшчае 312 адзінак, спіс публікацый саіскальніка – 77 адзінак). Агульны аб’ём дысертацыі – 237 с., асноўны тэкст займае 202 с., спіс літаратуры – 33 с., дадатак – 2 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

У першым раздзеле **«Тэарэтыка-метадалагічныя аспекты работы»** разглядаецца спектр навуковых паняццяў і падыходаў да праблемы даследавання.

У падраздзеле 1.1 **«Агульнатэарэтычныя падыходы»** паказваецца актуальнасць для навукі і культуры пытанняў нацыянальнага. Адзначаецца, што самым распаўсюджаным тэрмінам пры разглядзе сацыяльна-культурных аспектаў нацыі з сярэдзіны ХХ стагоддзя з’яўляецца паняцце «нацыянальная ідэнтычнасць». Акрэсліваецца змест паняццяў этнічная, нацыянальная/культурная ідэнтычнасць, іх узаемасувязь і ўзаемадзеянне. Выкладаецца сутнасць прымардыяльнага, мадэрнісцкага і постнекласічнага падыходаў у вывучэнні нацыянальнага.

У падраздзеле 1.2 **«Формы мастацкай рэалізацыі нацыянальнага»** асэнсоўваецца спецыфіка рэпрэзентацыі нацыянальнага ў прыгожым пісьменстве, а таксама акрэсліваюцца інтэрпрэтацыйныя стратэгіі, якія дазваляюць вылучыць і растлумачыць схаваныя ў літаратурным творы нацыянальныя культурныя коды. Адзначаецца, што нацыянальнае ў мастацкай літаратуры вылучаецца шматаспектнасцю форм выяўлення. Нацыянальнае – феномен перш за ўсё экзістэнцыйны, што прадугледжвае даследаванне інтэнцыянальна-светапогляднага, праблемнага, аксіялагічнага, эстэтычнага зместу мастацкага

твора. Спецыфіка нацыянальнага передаецца праз асаблівасці ўспрымання прасторы і часу, погляды на жыццё і смерць, стаўленне да прыроды, чалавека, да звышпрыроднага, праз адметнасці мыслення, эмацыянальныя рэакцыі.

Падкрэсліваецца, што спецыфіка нацыянальнага выяўляецца як у змесце твора, так і праз форму, сістэму мастацкіх сродкаў і прыёмаў, нацыянальную топіку, сімвалічныя вобразы, мастацкую дэталь, устойлівыя матывы і міфалагемы. Адметнасць мастацкіх прасторы і часу передаецца праз пэўныя этнакультурныя канстанты.

Такім чынам, вывучэнне нацыянальнага скіроўвае ўвагу даследчыка да асноўнай праблемы літаратуразнаўства – суадносін зместу і формы.

Акрэсліваецца сутнасць такіх паняццяў, як нацыянальная спецыфіка літаратуры, нацыянальны характар, нацыянальны менталітэт, нацыянальная ментальнасць, нацыянальны вобраз свету, нацыянальны светапогляд, нацыянальная ідэя. Абгрунтоўваецца мэтазгоднасць разгляду нацыянальнага светапогляду як кагнітыўнага кампанента менталітэту.

Адзначаецца, што істотным фактарам нацыянальнай ідэнтычнасці выступае сістэма рэлігійных поглядаў, а таксама сацыяльная дыферэнцыяцыя нацыянальнага. Праблема нацыянальнай ідэнтычнасці цесна звязана з праблемамі культурнай камунікацыі. Нацыянальная спецыфіка літаратуры ўсведамляецца праз асэнсаванне глабальнага і лакальнага, цэнтральнага і перыферыйнага, універсальнага і самабытнага, а таксама праз асэнсаванне адносін «Я» – «Іншы».

У падраздзеле 1.3 **«Гістарыяграфія праблемы»** разглядаюцца набыткі айчыннага літаратуразнаўства ў вывучэнні нацыянальнай спецыфікі беларускага прыгожага пісьменства. Адзначаецца, што актыўна да праблемы нацыянальнай самабытнасці беларускай літаратуры звяртаюцца пісьменнікі і публіцысты ў пачатку ХХ стагоддзя і ў 1920-я гады: В. Ластоўскі, М. Багдановіч, М. Гарэцкі, А. Луцкевіч, Ант. Адамовіч, С. Палуян, А. Бабарэка, Ф. Купцэвіч і інш.

Паказваецца, што літаратуразнаўства першай трэці ХХ стагоддзя мае выразную нацыяцэнтрычную скіраванасць. У работах С. Палуяна, В. Ластоўскага, М. Багдановіча, А. Луцкевіча сцвярджаецца нацыянальная самабытнасць беларускай літаратуры, якая абумоўлена гістарычна сфарміраваным менталітэтам. Адзначаецца, што крытыкай пачатку ХХ стагоддзя нацыянальная адметнасць беларускай літаратуры толькі канстатуецца, але прадметна не асэнсоўваецца. У 1920-я гады пытанні нацыянальнай спецыфікі літаратуры, нацыянальнай адметнасці культуры, беларускага стылю, беларускіх вобразаў закраналіся ў артыкулах Ф. Купцэвіча, Язэпа Пушчы, А. Бабарэкі, Кузьмы Чорнага.

Беларускім літаратуразнаўствам пазнейшага часу (работы Л. Гараніна, Ул. Гніламёдава, Ул. Конана, М. Тычыны, І. Чароты, А. Яскевіча) разгледжаны

такія аспекты нацыянальнай самабытнасці беларускай літаратуры, як спецыфіка нацыянальнага паэтычнага стылю, асобныя нацыянальныя мастацкія архетыпы, нацыянальная ідэя, увасобленая ў мастацкім слове. Акрэслена тыпалогія беларускай літаратуры, вызначаны яе характаралагічныя рысы: арганічнае спалучэнне лірычнага, эмацыянальнага, пачуццёвага і быццёвага (якое адначасова выступае і як быційнае).

У падраздзеле 1.4 **«Метадалогія даследавання»** абгрунтоўваецца тэарэтычна-метадалагічны інструментарый работы. Адзначаецца, што найбольш аптымальным для нашага даследавання з’яўляецца комплексны падыход, выкарыстанне розных метадалагічных стратэгій: культурна-гістарычнага, параўнальна-гістарычнага, рэцэптыўнага, структурна-семантычнага метадаў.

У межах комплекса даследаванняў, якія склалі тэарэтычна-метадалагічную аснову нашай работы, вылучаюцца наступныя групы.

Літаратуразнаўства: работы А. Адамовіча, Ул. Гніламёдава, П. Васючэнкі, Л. Гараніна, В. Жураўлёва, В. Каваленкі, Л. Корань, М. Мушынскага, В. Халізева, М. Тычыны, І. Чароты, А. Яскевіча; працы літаратуразнаўцаў, якія даследуюць нацыянальную праблематыку на матэрыяле літаратуры (І. Кабанавай, М. Паповай, С. Шэшуновай, С. Андрусіў, М. Жулінскага, М. Ільніцкага, П. Іванішына).

Філасофія, культуралогія і эстэтыка: работы І. Бабкова, М. Бахціна М. Бярдзяева, Р. Барта, Г. Гачава, Ул. Конана, А. Рагулі, Ю. Лотмана, В. Тапарова, М. Хайдэгера.

Тэорыя нацыянальнага: работы Б. Андэрсана, Х. Бхабхі, Э. Гельнера, Э. Саіда, Э. Сміта і інш.

У другім раздзеле работы **«Асэнсаванне нацыянальнага крытыкай і публіцыстыкай першай трэці ХХ стагоддзя»** адзначаецца, што сутнасць паняцця беларускасці фарміравалася як мастацкімі, так і літаратуразнаўчымі, крытычнымі тэкстамі, публіцыстыкай. Вывучэнне канцэптуалізацыі нацыянальнага на розных узроўнях (у публіцыстыцы, навукова-крытычнай думцы і мастацкай літаратуры) з’яўляецца прадуктыўным для разумення цэласнай карціны нацыянальнага самаўсведамлення пэўнай культурна-гістарычнай эпохі. Аналіз публіцыстыкі, літаратурна-крытычных работ дазваляе ўзнавіць культурны, грамадскі кантэкст напісання мастацкіх твораў, дае магчымасць глыбока і поўна раскрыць спецыфіку тагачаснай культурнай сітуацыі.

Падваліны нацыянальнага самаўсведамлення закладваліся нашаніўскімі пісьменнікамі-адраджэнцамі. Пытанні нацыянальнага разглядаліся ў работах В. Ластоўскага, А. Луцкевіча, С. Палуяна, М. Гарэцкага, М. Багдановіча, Ул. Жылкі, А. Уласава, Ул. Самойлы, Я. Лёсіка, А. Цвікевіча. Ф. Шантыра.

Дзякуючы В. Ластоўскаму, А. Луцкевічу, М. Багдановічу, С. Палуяну

нацыянальнае перастае атаясамлівацца выключна з этнічнай сферай і пачынае выступаць полем для культурнага самавызначэння.

Прадстаўнікі адраджэнскага руху сцвярджалі нацыянальную дадзенасць беларускага народа, яго «кантуітыўную этнатэрытарыяльную ўкарэненасць» (Г. Корбіч), нацыянальна-самабытны характар беларускай культуры.

Галоўныя інтэнцыі дзеячаў нацыянальнага адраджэння накіраваны на ўсеахопны аналіз сацыяльнага і культурнага становішча нацыі дзеля выхаду яе на новы ўзровень развіцця, на сцвярджэнне самабытнасці беларускай нацыі, выхаванне новага вобраза беларуса, самастойнага і самадастатковага суб’екта гісторыі, на далучэнне народа да вопыту нацыянальнай гісторыі, абуджэнне гістарычнай памяці.

Істотную ролю ў працэсе станаўлення нацыянальнай ідэнтычнасці адыгрывае гістарычная свядомасць, супольная гістарычная памяць. Вядома, што адчуванне нацыянальнай прыналежнасці мае як прасторавае, так і часавае вымярэнне. Нацыянальная гісторыя – гэта своеасаблівы наратыў, які будуецца на аснове пэўных гістарычных падзей і асоб. Выбар гэтых падзей залежыць ад запатрабаванняў нацыі ў асэнсаванні яе сучаснага становішча.

Вызначальнымі ў сфармуляванай адраджэнскімі коламі канцэпцыі беларускага выступаюць наступныя палажэнні: Беларусь у мінулым мела ўласную дзяржаўнасць (Полацкае княства і Вялікае Княства Літоўскае), беларуская культура дасягнула ў ВКЛ высокага ўзроўню развіцця, беларуская мова мела статус дзяржаўнай. Менавіта нашаніўскія аўтары закладваюць у падмурак нацыянальнай літаратуры матыў велічнага мінулага Беларусі.

Выбудоўваецца пэўны пантэон беларускіх гістарычных (князь Усяслаў, Вітаўт, Ягайла, Гедымін, Жыгімонт, Леў Сапега, Радзівілы, Хадкевічы, Кастусь Каліноўскі) і культурных дзеячаў (Францыск Скарына, Сімяон Полацкі, Пётр Мсціславец, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Людвік Кандратовіч, Эліза Ажэшка). В. Ластоўскі, А. Луцкевіч адносяць да беларускай культуры і тых пісьменнікаў, выхадцаў з Беларусі, якія пісалі на іншых мовах, паколькі ў іх творах увасоблена спецыфіка беларускага менталітэту.

У ідэнтыфікацыйны код беларускай культуры закладваецца канцэпцыя памежнага становішча краю (работы І. Канчэўскага, Ул. Самойлы, В. Ластоўскага, К. Каганца, Я. Лёсіка).

У публіцыстыцы першай трэці ХХ стагоддзя замацоўваецца палажэнне пра поліэтнічны характар Беларусі, беларускую талерантнасць.

Сцвярджаецца, што канфесійная прыналежнасць у дачыненні да Беларусі не з'яўляецца характаралагічным паказчыкам, акцэнтуецца ўвага на важнасці паганскага фактару ў фарміраванні нацыянальнага светапогляду беларусаў.

Побач з тэзісам пра высокі ўзровень развіцця беларускай культуры, дзяржаўнасці ў мінулым афармляецца тэзіс пра тагачасны беларускі народ як народ-пакутнік, беларускае пачатку XX стагоддзя атаясамліваецца з ніжэйшымі сацыяльнымі слаямі.

Цэнтральнае месца ў публіцыстыцы пачатку XX стагоддзя займае моўнае пытанне, абарона правоў беларускай мовы. Мова падаецца як вызначальны маркер нацыянальнага.

Прадстаўнікі нацыянальна-адраджэнскага руху абгрунтоўваюць ідэю нацыянальнай незалежнасці Беларусі, а таксама ідэю ўзаемасувязі нацыянальнага абуджэння і сацыяльнага вызвалення беларуса.

Раздзел 3 **«Мастацкая мадэль нацыянальнага быцця ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя»** складаецца з трох падраздзелаў.

У падраздзеле 3.1 **«Спецыфіка мастацкага аўтавобраза Беларусі першай трэці XX стагоддзя»** разглядаецца нацыянальны міф, які фарміруецца ў літаратуры першай трэці XX стагоддзя, а таксама асэнсоўваецца адметнасць мастацкага аўтавобраза Беларусі.

Адзначаецца, што сёння адным з самых папулярных у навуцы выступае міфапаэтычны аспект асэнсавання нацыянальнага, згодна з якім кожная нацыя мае ўласнае своеасаблівае міфалагізаванае ўяўленне пра свет.

Нацыянальны міф – рухомае, дынамічнае ўтварэнне. Ён фарміруецца паступова, яго змястоўны аспект залежыць ад ідэалагічнага ўзроўню грамадства. Абавязковым для нацыянальнага міфа з'яўляецца гістарычны ракурс. Нацыянальны міф складаецца з уяўленняў пра нацыянальную этыялогію, комплекса знакавых гістарычных падзей, у тым ліку трагічных, уключае прагноз на будучыню. З сапраўднымі гістарычнымі падзеямі нацыянальны міф суадносіцца нелінейна.

Паказчыкам сталага нацыянальнага міфа выступае як комплекс уяўленняў адносна ўласнага «Я», так і комплекс уяўленняў адносна ўзаемаадносін паміж «Я» і «Іншым».

Нацыянальны міф складаецца з сукупнасці тэкстаў самых розных жанраў.

У пачатку XX стагоддзя ў нашым прыгожым пісьменстве адбываецца афармленне міфа паходжання, міфа пра велічнае мінулае краю, а таксама міфа пакутаў. Генеалогія беларускай дзяржаўнасці выводзіцца ад Полацкага і Тураўскага княстваў, Вялікага Княства Літоўскага. В. Ластоўскі («Лабірынты») Карусь Каганец («Сын Даніла») імкнуцца актуалізаваць старонкі Полацкай

гісторыі, тыя моманты, якія сведчылі пра дзяржаўнасць, высокі ўзровень развіцця беларускай культуры. Так, В. Ластоўскі звяртаецца да вобразаў полацкіх уладароў (Рагвалода, Рагнеды, Усяслава Чарадзея), сына Рагнеды і Уладзіміра Ізяслава, які княжыў у Заслаўі.

В. Ластоўскі «залаты век» Беларусі звязвае з Полацкім княствам, у М. Гарэцкага «залаты век» атаясамліваецца з росквітам беларускай культуры ў часы Вялікага Княства Літоўскага, у прозе Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага, Лукаша Калюгі, Змітрака Бядулі ўзгадкі пра «залаты век» адсутнічаюць, пісьменнікі не вылучаюць нейкага перыяду ў беларускай гісторыі, які мог бы прэтэндаваць на статус ідэальнага.

Стан Беларусі пачатку ХХ стагоддзя ацэньваецца як стан заняпаду. У літаратуры супрацьпастаўляюцца былая веліч і сучаснае занядбанне (аповесць «Лабірынты», апавяданне «Прывід» В. Ластоўскага, апавяданні «Князёўна», «Войт», «Лірныя спевы» М. Гарэцкага).

Паказваецца, што асноўнымі кампанентамі мастацкага аўтавобраза Беларусі выступаюць тэрыторыя, якую вылучаюць пэўныя прыродна-ландшафтныя асаблівасці, геаграфічныя межы, топасы радзімы, гістарычныя падзеі, гісторыка-культурныя персаналіі, канфесійны склад, спецыфіка побыту.

Наратыў нацыі абавязкова абапіраецца на ўяўленні пра прастору, змяшчае вобраз сваёй зямлі. Беларускія літаратары апісваюць розныя рэгіёны і мясціны Беларусі, з гэтых лакальных вобразаў і фарміруецца абагульнены вобраз краіны.

Канцэпцыя памежнага становішча Беларусі пададзена і ў мастацкіх творах: «Лабірынты» В. Ластоўскага, «Тутэйшыя» Янкі Купалы, «Лірныя спевы», «Ціхая плынь» М. Гарэцкага, «Трыццаць год», «Пошукі будучыні», «Млечны шлях», «Вялікі дзень» Кузьмы Чорнага. М. Гарэцкі ў сваіх творах («Дзве душы», «Антон») піша пра адкрытасць беларуса і Захаду і Усходу, пра «дзве душы» беларуса, здольнасць зразумець памкненні і рускага, і паляка.

Беларусь у літаратуры першай трэці ХХ стагоддзя паказана як краіна шматэтнічная і поліканфесійная, што ізноў жа абумоўлена геапалітычным становішчам («Лабірынты» В. Ластоўскага, «У дрымучых лясах», «Набліжэнне» Змітрака Бядулі, «На чорных лядах», «Гой» М. Лынькова). Аўтэнтычны свет жыцця яўрэйскай сям'і намаляваны Змітраком Бядулем у аповесцях «У дрымучых лясах» і «Набліжэнне».

У ідэнтыфікацыйны код беларускай літаратуры першай трэці ХХ стагоддзя закладваецца канцэпцыя трагічнага лёсу нацыі, што тлумачылася геапалітычным становішчам краю і неспрыяльнымі гістарычнымі ўмовамі. Прыгожае пісьменства даследуе механізмы каланізацыі, вынішчэння нацыянальнага («Тутэйшыя» Янкі

Купалы, «Ціхая плынь», «У чым яго крыўда?», «Віленскія камунары» М. Гарэцкага, «Бацькаўшчына», «Пошукі будучыні» Кузьмы Чорнага).

Для мастацкай літаратуры гэтага часу характэрна супярэчлівая сацыяльная ідэнтыфікацыя беларускага. М. Гарэцкі працягвае распачатую Ф. Багушэвічам традыцыю атаясамлівання беларускага з ніжэйшымі сацыяльнымі слаямі. Беларуская мова маркіруецца пісьменнікам як «простая мова». У творах В. Ластоўскага, Каруся Каганца элітарнае (вобразы князёў, вучоных, асветнікаў) натуральна ўключаецца ў склад нацыянальнага.

У падраздзеле 3.2. разглядаецца **«Вобраз “Іншага” ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя».** Адзначаецца, што менавіта памежжа выступае прадуктыўнай сферай фарміравання этнакультурных стэрэатыпаў. Аўтавобраз і гетэравобраз цесна ўзаемазвязаны паміж сабой, а вобраз «Іншага» фарміруецца зыходзячы з вобраза ўласнага «Я» і, такім чынам, характарызуе ўласна рэцыпіента. Прадстаўнікі асобнай нацыі ўспрымаюць розныя праявы «Іншага» скрозь прызму ўласнай культуры, традыцый і каштоўнасцей. Такім чынам, этнічны стэрэатып «Іншага» пэўным чынам уплывае на фарміраванне менталітэту рэцыпіента, выступае своеасаблівым каталізатарам ідэнтычнасці. Калі «Іншы» – форма прымання і згоды на адрознасць, то «Чужы» – форма адасаблення, а часам і агрэсіі. Мяжа паміж «Чужым» і «Іншым» дастаткова тонкая і зменлівая. «Іншымі» ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя выступаюць, палякі, яўрэі, татары, немцы (аўстрыйцы), цыгане. «Чужымі» ў творах беларускай прозы 1940-х гадоў паўстаюць носьбіты фашысцкай ідэалогіі (творы Кузьмы Чорнага).

У беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя знайшлі сваё выяўленне і пэўныя нацыянальныя стэрэатыпы.

У падраздзеле 3.3 асэнсоўваецца адлюстраванне літаратурай праблемы «**Станаўленне беларуса як суб’екта гісторыі**». Сцвярджаецца, што намаганні празаікаў першай трэці ХХ стагоддзя накіраваны на зацвярджэнне ў мастацкай свядомасці вобраза беларуса як самадастатковага суб’екта гісторыі: творы В. Ластоўскага, Янкі Купалы, М. Гарэцкага, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага.

Працэс самаўсведамлення, індывідуалізацыі пачынаўся з Ф. Багушэвіча і Янкі Купалы. Героем твораў М. Гарэцкага з’яўляецца ўжо інтэлігент, герой, які рэфлексуе, чыё прызначэнне – асэнсаванне сябе і свету. Больш за тое, герой пісьменніка выступае як мэтанакіраваны суб’ект дзеяння. Паказальна, што героі М. Гарэцкага абіраюць «дзейсныя» прафесіі: каморнік, медык. Пра станаўленне героя як суб’екта гісторыі сведчыць узнятая М. Гарэцкім тэма асабістай адказнасці чалавека за свае паводзіны, намеры, адказнасць перад будучыняй:

апавяданне «Роднае карэнне», аповесць «Дзве душы». Пісьменнік імкнецца выхаваць у беларусаў самапавагу, веру ў сябе.

Дзякуючы М. Гарэцкаму павышаецца інтэлектуальны ўзровень героя беларускай літаратуры: ён пачынае актыўна цікавіцца складанымі пытаннямі ўзаемаадносін інтэлігенцыі і народа, інтэлігенцыі і ўлады (аповесці «У чым яго крыўда?», «Меланхолія», «Дзве душы»). Герой М. Гарэцкага – чалавек выразна акрэсленай нацыянальнай пазіцыі. Ён абірае шлях сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення.

Вызначальнае ў роздумах Андрэя Лабановіча, героя «На ростанях» Якуба Коласа, – пошук свайго месца ў жыцці, асэнсаванне прызначэння інтэлігенцыі.

Канцэпцыя дзейснага чалавека ў творах Кузьмы Чорнага – таксама вынік працэсу станаўлення беларуса як суб’екта гісторыі, станаўлення беларусаў як нацыі. Скразны матыў твораў пісьменніка – ідэя жыццебудаўніцтва. Героі яго твораў – людзі актыўныя, «утварыцелі жыцця» (апавяданні 1920-х гадоў, раманы «Сястра», «Ідзі, ідзі»).

Герой рамана «Сцежкі-дарожкі» Міхася Зарэцкага Васіль Лясніцкі імкнецца самастойна разабрацца ў складаных грамадскіх працэсах, якія адбываюцца ў краіне, што таксама з’яўляецца сведчаннем праяўлення суб’ектнасці. Як прадстаўнік інтэлігенцыі ён імкнецца захаваць прынцыпы маральнасці, асэнсоўваць грамадскія працэсы праз прызму чалавечнасці.

Раздзел 4 **«Нацыянальны светапогляд праз прызму беларускай прозы першай трэці ХХ стагоддзя»** прысвечаны разгляду спецыфікі выяўлення мастацкай літаратурай беларускага менталітэту. Раздзел складаецца з пяці падраздзелаў. Падкрэсліваецца, што беларускія пісьменнікі першай трэці ХХ стагоддзя акрэсліваюць уласную мадэль дыскурсу нацыянальнай самабытнасці. Літаратура даследуе як сацыяльна-гістарычныя, так і духоўныя заканамернасці жыцця нацыі, імкнецца ўсвядоміць іманентна ўласцівае беларусам, асэнсаваць філасофію нацыянальнага быцця, кодэкс нацыянальнай этыкі.

У падраздзеле 4.1 асэнсоўваецца **«Канцэпт зямля ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя»**. Адзначаецца, што мастацкі тэкст як прадукт нацыянальнага выступае каштоўным матэрыялам для даследавання спецыфікі светапогляду, ментальнасці пэўнай нацыі. Нацыянальная літаратура – гэта своеасаблівая паліфанія, дзе зашыфраваны духоўны вопыт нацыі, семантыка нацыянальнай культуры, Космас нацыянальнага. Рэчаіснасць тут падаецца праз прызму ўспрымання аўтара, прадстаўніка пэўнай нацыі.

Сцвярджаецца, што ў творах Якуба Коласа, М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага шырока і ўсеахопна адлюстраваны нацыянальны свет жыцця беларусаў,

пададзены цэлы шэраг нацыянальных характараў у розных абставінах нацыянальнага быцця, пададзены абагулены вобраз беларускага народа. Героі пісьменнікаў паўстаюць як носьбіты нацыянальнай псіхалогіі і свядомасці, увасабляюць пэўныя рысы нацыянальнага характару. Ідэйны пафас твораў Якуба Коласа, М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага – імкненне засведчыць у свеце беларускую прысутнасць, перадаць «беларускі вобраз свету».

Магутны нацыянальна-культурны пласт увасоблены ў творах М. Гарэцкага. Гэта выяўленне глыбінных першавобразаў-архетыпаў, ментальна-псіхалагічных комплексаў, асэнсаванне сутнасна-анталагічных асноў беларускай нацыі (аповесць «Антон», апавяданні «Што яно», «Роднае карэнне», аповесць «Дзве душы», п’еса «Жартаўлівы Пісарэвіч» і інш.). У творах пісьменніка пададзена пэўная канцэпцыя нацыянальнага светапогляду. Свой народ М. Гарэцкі называў «Філосафам» і «Лірнікам», убачыўшы ў схільнасці беларусаў да «патаемнага», здольнасці бачыць рэчаіснасць, насычанай дзівосамі, сведчанне духоўнасці, паэтычнасці народа.

Вытокі беларускай самасці абумоўлены спецыфічнымі геаграфічнымі ўмовамі і гістарычнымі абставінамі. Найпершае ўздзеянне на станаўленне нацыянальнага светапогляду, непаўторна-самабытнай культуры, ладу і стылю мыслення мае прырода, ва ўлонні якой народ сцвярджае сваё гістарычнае быццё. Вядома, што тып прасторы фарміруе пэўны «ландшафт мыслення» (тэрмін В. П. Падарогі).

Беларуская нацыя фарміравалася як земляробчая ў сваёй аснове, што і вызначыла пэўны тып менталітэту. Безумоўна, памылкова абмяжоўваць паняцце «нацыянальнае» толькі сацыяльным, аднак менавіта з сялянствам звязана апрацоўка геаграфічнага ландшафту, што ўплывае і на ландшафт культуры. У вёсцы на працягу стагоддзяў захоўваліся важнейшыя прыкметы этнасу, яго традыцыі, звычаі, мараль.

Тэма Бацькаўшчыны, зямлі, апяванне жыцця чалавека на зямлі – ключавая ў беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя. У творах Якуба Коласа, М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага, Кандрата Крапівы, Цішкі Гартнага, М. Лынькова, Лукаша Калюгі ўзнаўляюцца традыцыйны свет жыцця беларусаў, характаралагічныя знакі беларускага, звычаі, мараль, этыка, выяўляюцца нацыянальна каштоўныя рысы характару.

Вызначальнымі канстантамі нацыянальнага прыгожага пісьменства першай трэці XX стагоддзя выступаюць канцэпты зямля, чалавек, Бацькаўшчына, родны кут. Зямля – адна з галоўных ментальных асноў беларускай нацыі, цэнтр беларускага вобраза свету, што і адлюстравана нашай літаратурай. Жыццё народа, сцвярджэнне адвечнасці, пераемнасці быцця з’яўляецца скразным матывам

беларускай літратуры, выступае ў якасці нацыянальнага сюжэта: творы Якуба Коласа, М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага, І. Мележа, І. Пташнікава, В. Адамчыка, І. Чыгрынава. Зварот да сялянскай тэмы – гэта зварот да асноватворных момантаў нацыянальнага жыцця, імкненне спасцігнуць карэнныя пытанні быцця народа. Што прадвызначае своеасаблівую танальнасць твораў, пэўны тып героя і канфлікту, пэўны маральны патэнцыял.

Сялянства ўсведамляецца як субстрат нацыі, традыцыі, створаныя сялянскай культурай, успрымаюцца як першакрыніца этычных уяўленняў народа.

Творамі, дзе ўвасоблены Космас нацыянальнага быцця, побыт і светапогляд беларуса, выяўлены адметнасці нацыянальнага характару, сталі паэма «Новая зямля» Якуба Коласа, раманы «Зямля», «Пошукі будучыні», «Бацькаўшчына», «Скіп’ёўскі лес», «Вялікі дзень» Кузьмы Чорнага.

Тып культуры, спецыфіка мыслення нацыі вызначаецца найперш спосабам засваення прасторы і часу. Прыродныя ўмовы абумоўліваюць пэўны характар жыццядзейнасці. У аснове «знакавых» твораў беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя (паэме «Новая зямля» Якуба Коласа, рамане «Зямля» Кузьмы Чорнага) – дынаміка біялагічных працэсаў.

Узнаўленне нацыянальнага вобраза свету, змадэляванага ў беларускай літаратуры, мае філасофскі характар, бо звязана з аналізам фундаментальных канцэптаў – вобразаў зямлі, Бацькаўшчыны, народа, дома.

Зямля падаецца як асноватворная, універсальная каштоўнасць. Цэнтральная тэма паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа, рамана «Зямля» Кузьмы Чорнага – тэма пошуку-атрымання сваёй зямлі, пошуку зямлі як імкненне набыць трываласць, Быць. Філасофія «сваёй зямлі» ў беларускай літаратуры заключаецца ва ўкарэненасці ў прасторы, жыццёвай трываласці беларускага чалавека.

Зямля забяспечвае пераемнасць быцця, яна – «крыніца вітальнасці» (П. Васючэнка). Вобраз зямлі набывае глыбокі сімвалічны змест. Вядучы лейтматыў твораў Кузьмы Чорнага і Якуба Коласа – «зямля-карміцелька». Пісьменнікі паслядоўна прасочваюць жыццёвы шлях селяніна, які працякае на зямлі і з зямлёю звязаны. Адсюль – і своеасаблівая філасофія існавання, так званы «філасофскі ўніверсалізм» (П. Васючэнка) твораў Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Лукаша Калюгі.

Зямля, «свая зямля» мае ў творах Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Лукаша Калюгі філасофскае значэнне – гэта адначасова і Бацькаўшчына, Радзіма. Барацьба за зямлю ў творах беларускіх пісьменнікаў – гэта перш за ўсё барацьба за годнае жыццё, сцвярджэнне права быць гаспадарамі на сваёй зямлі, у сваёй Айчыне. Гісторыю беларускія пісьменнікі разглядаюць як укаранёнасць у сваю зямлю, тэрыторыю.

Такім чынам, семантычнае развіццё канцэпта зямля ў беларускай літаратуры наступнае: зямля – сям'я – народ – нацыя.

Высновы беларускіх пісьменнікаў пра арганічную сувязь чалавека і роднай зямлі аналагічныя герменеўтычнай максіме заснавальніка фундаментальнай анталогіі М. Хайдэгера пра радзіму ак аснову быцця чалавека ў свеце. Страта зямлі для герояў беларускай літаратуры раўназначная страце жыццёвай асновы.

У творах беларускай літаратуры выяўлены пэўны тып селяніна. Гэта чалавек, моцна ўкаранёны ў жыццё, зямлю, у нечым кансерватыўны, не схільны да змен і пераўтварэнняў. Спадзяецца ён толькі на ўласны спрыт, працу, розум. Знітаванасць селяніна з зямлёй, укаранёнасць у жыццё абумовілі цалкам рацыянальны пачатак у яго спосабе мыслення.

У падраздзеле 4.2 **«Архетып “роднага кута”»** асэнсоўваюцца ключавыя архетыпы беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя. Выяўленне ўзаемасувязі асобных вобразаў і матываў дазваляе акрэсліць нацыянальны вобраз свету як сістэму. Адзначаецца, што спасціжэнню ўнікальнага духоўнага вопыту народа спрыяе расшыфроўка архетыпных вобразаў і матываў, якія выступаюць у якасці змястоўнай, кагнітыўнай сферы мастацкага пазнання. Асэнсаванне механізмаў узнікнення і бытавання актуальных для беларускага прыгожага пісьменства архетыпных вобразаў дапамагае зразумець заканамернасці мастацкага функцыянавання глыбінных нацыянальна-анталагічных пластоў свядомасці. Разгляд мастацкага твора ў аспекце этнічнай псіхалогіі і менталітэту, праз нацыянальныя міфалагемы і архетыпы дазваляе таксама паказаць арыгінальнасць і ўнікальнасць літаратуры, яе нацыянальную самабытнасць, дазваляе акрэсліць гісторыка-культурныя канстанты нацыянальнага вобраза свету.

Архетыпы нясуць у сабе кодавыя, сутнасныя прыкметы светабачання. У дачыненні да творцы яны выяўляюцца ў выбары пэўных тэм, ідэй, сюжэтаў, вобразаў.

Скразным у беларускай літаратуры, пачынаючы ад Ф. Скарыны, з'яўляецца вобраз «роднага кута». Абагулены мастацкі вобраз «роднага кута» вызначае спецыфіку беларускага вобраза свету, дазваляе асэнсаваць светапоглядную канцэпцыю беларускай літаратуры. Архетып «роднага кута» дэманструе такую паказальную рысу ў менталітэце беларусаў, як імкненне метафізічна вызначыцца, мець акрэсленае месца ў свеце, дзе можна пачуваць сябе гаспадаром. Сакралізацыя «роднага кута» ў нацыянальным прыгожым пісьменстве – імкненне сцвердзіць права народа на сваю тэрыторыю. Гэта ідэя – адна з цэнтральных у паэме «Новая зямля» Якуба Коласа, рамане «Зямля» Кузьмы Чорнага, творах Лукаша Калюгі.

Паказальна, што беларускія аўтары часцей за ўсё звяртаюцца да апісання родных ім мясцін: Кузьма Чорны – Цімкавіч, Міхась Зарэцкі – Магілёўшчыны, Лукаш Калюга – Койданаўшчыны (цяпер – Дзяржынскі раён Мінскай вобласці). Літаратары пазнейшага часу: І. Мележ – Гомельскага Палесся, І. Чыгрынаў – Магілёўшчыны, В. Адамчык – Гродзеншчыны, Ул. Гніламёдаў – Брэстчыны.

«Родны кут», «малая радзіма» – гэта комплекс пэўных фактараў, якія складаюць «духоўную тапаграфію» героя беларускай літаратуры. Вобраз Бацькаўшчыны, «роднага кута» ў творах беларускай літаратуры падаецца не толькі як канкрэтная, але і як пачуццёвая, псіхалагічная рэальнасць. Героя беларускай літаратуры вылучае адчуванне інтымнай, унутранай прывязанасці да тэрыторыі, зямлі, на якой давялося нарадзіцца і жыць. Гэтая прывязанасць аформілася ў топасах «родны край», «родная зямля», «родны дом», «родная вёска», «родны хутар». У Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага «родны кут» – свет цалкам пазітыўны. Канцэптуальным момантам твораў Якуба Коласа, М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага, Лукаша Калюгі з’яўляецца сцвярджэнне непадзельнасці ўнутранага свету чалавека (мікракосму) і макракосму радзімы, «родных каранёў». Надзвычай выразна гучыць матыў грунту, сувязі з родным.

Вобраз «роднага кута» раскрываецца ў дынаміцы – ад вобраза «малой радзімы», прасторава абмежаванай суб’ектыўнымі ўражаннямі, да абагуленага вобраза Беларусі.

У сістэме беларускай нацыясофіі «родны кут» як знакавая этнічная і філасофская рэальнасць беларускага быцця паўстае істотным сэнсавым элементам, праз які раскрываюцца і нацыянальныя этычныя каштоўнасці.

Сталае пражыванне этнасу ў межах адной тэрыторыі, прасторавая замкнёнасць спрыяюць фарміраванню ў свядомасці чалавека часавага, а не прасторавага ўяўлення. Прастора ў творах беларускіх празаікаў, як правіла, замкнёная, лакальная, структурыраваная і вызначаная, без адчування перспектывы, шырыні. Адсюль – аўтаномнасць дзеяння, абмежаванасць яго пэўнай мясцовасцю.

З архетыпам «роднага кута» цесна звязаны вобраз дому, хаты, свайго гнязда. Вобраз дому валодае багатай семантыкай, з’яўляецца «прасторавым знакам». Дом – гэта, перш за ўсё, абароненасць, трываласць, грунт, зыходная канстанта чалавечага быцця. У катастрафічнай сітуацыі 1910-40-х гадоў (дзве сусветныя вайны, рэвалюцыі, падзел і ўз’яднанне Беларусі) дом у творах беларускай літаратуры выступае антытэзай хаосу і разбурэнню («Пошукі будучыні» Кузьмы Чорнага). Адбудова дому – імкненне вярнуць цэльнасць, спакой, адчуванне трываласці і абароненасці.

Вобраз дому звязаны з вобразам мяжы. Гэту мяжу ўвасабляюць сцены хаты. Характэрна, што часта пісьменнікі робяць акцэнт на нетрываласці сцен, іх няздольнасці абараніць жыхароў дому: «Гаротная» Ядвігіна Ш., «Мары», «Прывід» В. Ластоўскага.

У адрыве ад роднага – вытокі трагедыі герояў: «Камароўская хроніка», «Скарбы жыцця» М. Гарэцкага.

Беларуская тутэйшасць, засяроджанасць на сваім, сваёй зямлі, сваёй сям'і – сведчанне моцнага абарончага комплекса супраць спроб разбурэння нацыянальнай ідэнтычнасці.

Абавязковым кампанентам твораў беларускай літаратуры першай трэці ХХ стагоддзя з'яўляецца, як правіла, апісанне прыроды роднай краіны, сакралізацыя нацыянальнага ландшафту. Прыгажосць родных краявідаў выступае як антытэза нацыянальнаму і сацыяльнаму становішчу. На спробы нівелявання патрыятычных пачуццяў беларускія літаратары адказалі апяваннем роднай зямлі, «роднага кута».

З вобразам «роднага кута» звязана адна з вядучых тэм беларускай літаратуры – разуменне свету ў яго гармоніі. У ідэнтыфікацыйны код беларускай літаратуры закладваўся матыў «роднага кута» як раю. У творах беларускіх пісьменнікаў першай трэці ХХ стагоддзя падаецца ідэал гарманічнага ўніверсуму: імкненне быць гаспадарамі на сваёй зямлі, імкненне да пабудовы жыцця ў адпаведнасці з іманентна ўласцівымі беларусам каштоўнасцямі.

Падраздзел 4.3 «**Філасофія жыцця**» прысвечаны асэнсаванню адлюстраваных у мастацкай літаратуры поглядаў беларуса на свет. Адзначаецца, што ў беларускай прозе вербалізуецца нацыянальна адметная філасофія жыцця. Паказваецца, што беларуская літаратура сцвярджае важнасць перш за ўсё быційных каштоўнасцей, самога жыцця ўвогуле (раманы «Пошукі будучыні», «Млечны шлях» Кузьмы Чорнага). Літаратары перадаюць уласцівую беларусам здольнасць «адчуваць жыццё», успрымаць яго як Божы дар, што ўказвае на ўсведамленне беларусамі сапраўдных, а не ўяўных каштоўнасцей быцця. Увага да знешнепобытавых рэалій жыцця герояў у творах беларускай літаратуры не з'яўляецца прыкметай этнаграфізму і бытавізму. Здавалася б простае, някідкае звязана з глыбінным, з быційнымі асновамі.

Герой беларускай літаратуры ўсведамляе каштоўнасць любога тварэння прыроды, што вынікае з усведамлення каштоўнасці жыцця ўвогуле, «пакланення перад жыццём» (А. Швейцэр). З разумення ўніверсальнай каштоўнасці ўсяго існага вынікае і рацыянальнае стаўленне беларусаў да Абсалюту, усведамленне зменлівасці, рухомасці свету, прызнанне за адносным права на існаванне, талерантнасць і гуманізм.

Скразной ідэяй творчасці Кузьмы Чорнага была ідэя чалавечнасці, сцвярджэнне ідэалаў міласэрнасці, спачування, дабрыні. І гэта нягледзячы на тое, што творчасць пісьменніка прыпадае на часы панавання ідэй класавай нянавісці, варожасці. Адпаведна, самымі любімымі персанажамі Кузьмы Чорнага, рупарамі аўтарскіх ідэй, з’яўляюцца Маня Ірмалевіч, «сястра» для герояў, Радзівон Цівунчык, «шчыры чалавечнасцю» («Сястра»), Кравец («Трэцяе пакаленне»), фельчар («Пошукі будучыні»).

Такім чынам, беларуская літаратура далучала чытача да сапраўднага сэнсу быцця, сцвярджала ідэалы чалавечнасці, спагадлівасці, дабрыні.

У падраздзеле 4.4 асэнсоўваецца **«Сістэма маральна-этычных каардынат»** беларускай літаратуры. Адзначаецца, што гістарычны досвед нацыі самым непасрэдным чынам уплывае на фарміраванне аксіялагічных каштоўнасцей літаратуры. Беларускія пісьменнікі першай трэці ХХ стагоддзя ўзнаўляюць не толькі традыцыйны лад жыцця, але і нацыянальную этыку, тыя маральныя прынцыпы, што выпрацоўваліся не адно стагоддзе.

Маральна-этычныя прыярытэты нацыянальнага быцця асэнсоўвае М. Гарэцкі. Са старонак аповесці «Камароўская хроніка» паўстае гісторыя моцнага сялянскага роду Задумаў (Батураў), якія жывуць у адпаведнасці са строгай сістэмай маральных правіл. Прадстаўнікі роду выступаюць носьбітамі пэўных базавых архетыпаў (мадэляў чалавечых лёсаў), пэўных архетыпных уяўленняў пра чалавека: дзед Кузьма Батура – патрыярх сямейнага роду, Вялікі Старац. Бацька ўвасабляе аўтарытарнасць, закон. Ганна – архетып Маці, увасабленне дабрыні, пяшчоты, спагадлівасці, захавальніцы дамашняга ачага. Сыны ўвасабляюць логіку, інтэлект, волю да дзеяння, стваральнай працы. Марынка – маладая дзяўчына-нявеста – з’яўляецца носьбітам чысціні, непасрэднасці, самаахвярнасці. Паказальна, што яе лёс складваецца трагічна: Марынка заўчасна памірае ў выніку няшчаснага выпадку.

М. Гарэцкі ўзнаўляе натуральную плынь сялянскага жыцця: нараджэнне, сталенне, вяселле, выхаванне дзяцей, смерць, выяўляе сэнсавую змястоўнасць гэтага жыцця. Людзі, якія ад роду да роду працавалі на зямлі, валодаюць арганічным этычным пачуццём. Так, найважнейшым крытэрыем ацэнкі чалавека выступае ў пісьменніка стаўленне да іншага чалавека, да зямлі, працы. Працэс самавыяўлення героя заключаецца не ў гвалце і разбурэнні, а ў маральнасці, духоўнасці, творчай гаспадарчай ініцыятыве, стваральнай дзейнасці.

Героямі М. Гарэцкага, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Лукаша Калюгі найперш цэняцца дабрачыннасць і сумленнасць, адказнасць і надзейнасць. У сялянскай іерархіі каштоўнасцей значнае месца адводзіцца якасцям, што забяспечваюць гаспадарчыя патрэбы – здольнасці ўмела і дбайна працаваць,

разважлівасці, кемлівасці, стараннасці. Заможны чалавек у Кузьмы Чорнага (раман «Сястра») вылучаецца не толькі працавітасцю, адказнасцю, але і сваёй выключнай сумленнасцю. Беларускія пісьменнікі аналізуюць стаўленне герояў да зямлі не толькі ў практычным, але і ў духоўным сэнсе. Для героя беларускай літаратуры праца – магчымасць самарэалізацыі і творчасці («Новая зямля» Якуба Коласа, «Зямля» Кузьмы Чорнага). Нават у творах, напісаных «на патрэбу дня», з мэтай выканання сацыяльнага заказу ўслаўлення калектывізацыі (аповесць «Адшчапенец» Якуба Коласа), празаік пераканальна апісвае любоў селяніна да сваёй зямлі, гаспадаркі, працавітасць. Беларускія літаратары апяваюць народную жыццястойкасць, выяўляюць духоўную сутнасць сялянскага быцця, народнай этыкі, робяць акцэнт на важнасці захавання маральных каштоўнасцей.

Якуб Колас, Кузьмы Чорны, М. Гарэцкі вылучаюць у сваіх героях моц сямейных сувязей, добразычлівасць, спагаду, спачуванне адзін аднаму. Ідэйна-светапоглядныя ўстаноўкі беларускай літаратуры выразна апелююць да хрысціянскай этыкі і маралі (творы Якуба Коласа, М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага). Да Усявышняга звяртаюцца ў хвіліны роспачы і адчаю героі раманаў Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні», «Млечны шлях». Паказальным з’яўляецца ўнутраны маналог героя рамана «Вялікі дзень» Андрэя Мішурына. У жорсткі век класавага супрацьстаяння Кузьма Чорны імкнуўся сцвердзіць ідэалы суперажывання, спагады, што сведчыць пра магутны маральны патэнцыял як твораў самога пісьменніка, так і беларускай літаратуры ўвогуле.

У падраздзеле 4.5 разглядаецца **«Вітальнасць як важнейшы элемент беларускай мастацкай карціны свету».** Сцвярджаецца, што творы беларускай літаратуры вылучаюцца своеасаблівай вітальнасцю, жыццёвасцю. Гэта праяўляецца ў натуральнасці ва ўзнаўленні навакольнага асяроддзя, настраёвасці ў апісаннях. Прырода – быццё герояў твораў Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага. Яна ператвараецца ў набытак іх унутранага свету, форму духоўнага вопыту. Героі беларускай літаратуры жывуць у гармоніі з акаляючым асяроддзем. Творам айчыннай літаратуры ўласціва сакралізацыя ўзаемаадносін чалавека з наваколлем, паэтызацыя будзённага. Часам матыў прыроды ўзвышаецца ў творах беларускіх аўтараў да пантэістычных канцэпцый быцця. Асабліва моцна матыў вітальнасці, паэтызацыі зямлі як жыццядайнай сілы прагучаў у рамане «Зямля» Кузьмы Чорнага. Празаік апявае кожнае імгненне жыцця, кожную яго праяву. Віталістычнае гучанне твораў Кузьмы Чорнага праяўляецца і ў звароце пісьменніка да адлюстравання штодзённага жыцця, таго, што складае быццё селяніна ўвогуле. Раман «Зямля» – твор гранічнага паглыблення ў стыхію жыццёвага. Гэтая жыццёвасць, «заземленасць», паводле В. Каваленкі, мастацкага вобраза з’яўляецца паказальнай рысай беларускай літаратуры ўвогуле.

Творчасць М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага паўплывала на фарміраванне спецыфікі рэалізму беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя, нацыянальна кадыфікаваных спосабаў выяўлення рэчаіснасці.

У падраздзеле 4.6 «**Уплыў паганства на менталітэт беларуса**» адзначаецца, што пісьменнікі пачатку XX стагоддзя пастаянна звяртаюцца ў сваіх творах да вобразаў нацыянальнай міфалогіі, узгадваюць паганскія святы, перадаюць уласцівую беларусам веру ў розных міфічных істот, абагаўленне прыродных з’яў (В. Ластоўскі, М. Багдановіч, М. Гарэцкі). Для М. Гарэцкага патаёмнае – гэта тое «роднае карэнне», якое з’яўляецца паказальнай рысай нацыянальнага менталітэту. Гэта не столькі «пережитки древнего миросозерцания», па словах Адама Багдановіча, колькі тое іманентна ўласцівае беларусам, што яны захавалі на працягу стагоддзяў. Для М. Гарэцкага патаёмнае – паказчык інтэнсіўнага і багатага ўнутранага жыцця, імкненне спазнаць і растлумачыць навакольны свет.

Пісьменнікі пачатку XX стагоддзя пастаянна падкрэсліваюць суіснаванне ў светапоглядзе беларусаў хрысціянскага і паганскага.

Раздзел 5 «**Мастацкая гістарыясофія беларускай прозы першай трэці XX стагоддзя**» складаецца з трох падраздзелаў.

У падраздзеле 5.1 «**Гістарычны лёс беларускай нацыі праз прызму твораў М. Гарэцкага**» разглядаецца спецыфіка мастацкай гістарыясофіі М. Гарэцкага. Адзначаецца, што развіццё літаратуры ў кожнай краіне непарыўна звязана з гісторыяй народа, а праблема нацыянальнага лёсу – скразная ў творчасці класікаў славянскіх літаратур, асабліва тых, хто на працягу доўгага часу зазнаў нацыянальны прыгнёт. Глыбіня і маштабнасць праблем, узнятых беларускай літаратурай першай трэці XX стагоддзя, дазваляе гаварыць пра яе гістарыясофскую скіраванасць.

Гістарыясофія ў літаратуры – гэта комплекс гістарыясофскіх праблем і ідэй, увасобленых у мастака-вобразнай форме. Спецыфіка мастацкай гістарыясофіі – у яе эстэтычным модусе. Мастацкая гістарыясофія – гэта не дакументальнае ўзнаўленне гістарычных падзей, а іх эстэтычная і інтэлектуальная інтэрпрэтацыя.

Сутнасць і значэнне мастацкай гістарыясофіі заключаецца ў тым, што мастацтва слова здольнае ахапіць для асэнсавання тыя сферы, якія не даступныя навуковаму аналізу – сувязь гістарычных працэсаў і лёсу асобнага чалавека, залежнасць культурна-этычных нормаў супольнасці ад канкрэтнага часу.

З’яўленне мастацкіх твораў, скіраваных да спасціжэння гістарыясофскіх праблем, абумоўлена, перш за ўсё, культурна-гістарычнай сітуацыяй. Станаўленне новай беларускай літаратуры супала з працэсам актыўнага фарміравання беларускай нацыі, таму перад прыгожым пісьменствам паўстала задача сцвердзіць Беларусь, яе самабытнасць і суб’ектнасць, выпрацаваць пэўную

ахоўную ідэалогію, накіраваную на захаванне беларускай самасці. Такім чынам, паказальнай адзнакай мастацкай гістарыясофіі беларускай прозы выступае яе нацыясофская скіраванасць. У беларускай прозе 1910–40-х гадоў асэнсоўваюцца асноватворныя моманты нацыянальнага быцця, лёс нацыі ў мінулым, сучасным і будучым, актуальнейшыя пытанні часу. Больш за тое, наша проза ў асобе М. Гарэцкага і Кузьмы Чорнага спрабуе спасцігнуць заканамернасці гістарычнага працэсу ўвогуле, аб’ектыўны сэнс гістарычных падзей ХХ стагоддзя, іх духоўна-маральны аспект.

Адбываецца інтэнсіўны пошук адпаведных жанравых форм: ад малых эпічных форм, пісьменніцкіх дзённікаў, нарысаў да складаных эпічных структур («Ціхая плынь», «На імперыялістычнай вайне», «Камароўская хроніка» М. Гарэцкага, раманны цыкл Кузьмы Чорнага).

Праблема лёсу нацыі – у цэнтры аповесцей М. Гарэцкага «Ціхая плынь», «Дзве душы», «Камароўская хроніка», п’ес «Жартаўлівы Пісарэвіч», «Чырвоныя ружы», дакументальна-мастацкіх запісак «На імперыялістычнай вайне», апавяданняў кніг «Досвіткі», «Сібірскія абразкі».

У аповесці «Камароўская хроніка» пісьменнік спрабуе зразумець месца асобы ў агульнай структуры макракосму, асэнсоўвае лёс чалавека ў адзінстве з гістарычным лёсам народа, як духоўную пераемнасць пакаленняў. М. Гарэцкі малюе маштабную карціну быцця і побыту беларусаў, скрупулёзна даследуе нацыянальны характар. Жыццё нацыі ўзнаўляецца на значным гістарычным адрэзку часу – адмена прыгону, руска-японская вайна, Першая сусветная вайна, рэвалюцыя, савецка-польская вайна, 1930-я гады.

Паказальна, якія этапы нацыянальнай гісторыі акрэслівае М. Гарэцкі ў якасці вызначальных: 1863–1905, 1905–1917, 1917–1921, 1922–1923, 1924–1937 гг. Дзеянне твора абрываецца 1937 годам, надзвычай трагічным як для Беларусі, так і для самога пісьменніка. Для першай часткі аповесці характэрна аб’ектывізаваная, панарамная манера апавядання, для другой – выяўленне ўнутранага свету, дынамікі пачуццяў, перажыванняў герояў. «Камароўскую хроніку» вылучае арганічнае спалучэнне эпічнага, лірычнага і драматычнага.

М. Гарэцкі імкнецца максімальна глыбока пранікнуць у сутнасць важкіх гістарычных рэалій з мэтай адэкватнага пазнання мінулага і сучаснасці. Таму пісьменнік скрупулёзна фіксуе разнастайныя падзеі, як эпахальныя, так і быццам бы малазначныя ў іх часавай паслядоўнасці. «Камароўская хроніка» М. Гарэцкага – гэта не проста апісанне і сістэматызацыя ў храналагічнай паслядоўнасці пэўных гістарычных падзей, але імкненне перш за ўсё выявіць і спасцігнуць сутнасць гэтых падзей, іх уплыў на лёс чалавека, нацыі. Задума «Камароўскай хронікі», тыя мастацкія задачы, якія стаялі перад пісьменнікам, вызначылі паэтыку і жанравую

спецыфіку твора – хроніка. Жанр хронікі дазваляе адлюстраваць жыццё нацыі ва ўсёй яго шматграннасці, разнастайнасці, паўнаце. Асновай сюжэта ў творы М. Гарэцкага выступае гістарычны рух часу. Пісьменнік выяўляе ўзаемазалежнасць гістарычных падзей і лёсу як асобнага чалавека, сям'і, так і нацыі ў цэлым.

Звяртаючыся да адлюстравання нацыянальнага лёсу ў пераломныя моманты гісторыі, М. Гарэцкі імкнецца акумуляваць быццёвы вопыт нацыі. Светапоглядныя аспекты беларускай мадэлі быцця асэнсоўваюцца пісьменнікам на розных узроўнях – і мікракосм асобы, і мікракосм нацыі. М. Гарэцкаму ўласціва шырыня погляду на свет, успрыманне яго як пэўнай цэласнасці, у адзінстве агульнага і асабістага.

У цэнтры ўвагі М. Гарэцкага як сацыяльна-гістарычныя, так і духоўныя заканамернасці нацыянальнага быцця. Пісьменнік імкнецца спасцігнуць іманентна ўласцівае беларусам, асэнсаваць філасофію нацыянальнага быцця, сцвердзіць трываласць духоўных асноў. Акцэнт у М. Гарэцкага зроблены менавіта на сцвярджэнні першаступеннай важнасці нацыянальна-духоўнай кампаненты быцця. Быццё чалавека не абмяжоўваецца нараджэннем і смерцю, яно ўключана ў мінулае, сучаснае і будучае народа, што суадносіцца з высновамі М. Хайдэгера.

У прозе пісьменніка на шырокім сацыяльна-бытавым фоне адлюстраваны не толькі гісторыя жыцця сялянскага роду, але і рост свядомасці чалавека. М. Гарэцкі паказвае працэс нацыянальнага самаўсведамлення, станаўлення нацыянальнай інтэлігенцыі. У дзённікавых запісах герояў, лістах, дзе зафіксаваны самыя розныя жыццёвыя падзеі, перажыванні ўнутранага плана, прасочваецца цэласнасць асобы, жаданняў, акрэсленае імкненне быць актыўным суб'ектам працэсу нацыянальнага адраджэння.

Апісанне часава-прасторавай спецыфікі ў «Камароўскай хроніцы» выконвае не толькі анталагічную, але і аксіялагічную функцыю, паколькі адлюстроўвае ўяўленні аўтара і герояў пра пэўны час, утрымлівае ацэнку часу. На працягу разгортавання дзеяння ў «Камароўскай хроніцы» ўзмацняецца трагічны пафас твора, павялічваецца колькасць трагічных падзей. Праз лёс асобнага чалавека, сям'і пісьменнік выявіў драматызм і трагізм гісторыі, трагізм нацыянальнага быцця. Гэта абумоўлівае глыбіню філасофскага падтэксту твораў М. Гарэцкага.

М. Гарэцкі фактычна паказаў трагізм знікнення сялянскай цывілізацыі з яе ўсталяванымі законамі, этычнымі нормамі, якая з'яўлялася падмуркам беларускай самабытнасці.

Беларускія філосафы, культуролагі ў якасці ключавых у фарміраванні нацыянальнага характару традыцыйна называюць драматычныя гістарычныя ўмовы. Траўматычная рэальнасць, у якой існаваў беларускі этнас на працягу апошніх стагоддзяў, мае сістэмны характар – пастаянныя войны, рэвалюцыі,

змены сацыяльнага ладу. Адпаведна, сярод пытанняў, якія знаходзіліся ў цэнтры ўвагі беларускіх пісьменнікаў першай трэці ХХ стагоддзя, выступае комплекс праблем, звязаных з асэнсаваннем нацыянальнай ментальнай траўмы трагізму нацыянальнай гісторыі.

У адносінах да беларускай сітуацыі апошніх стагоддзяў можна гаварыць пра траўму сацыяльную, нацыянальную, культурную. Мастацкая аналітыка траўмы звязана з асэнсаваннем як антрапалагічнага вопыту асобы, так і з даследаваннем нацыянальных ментальных комплексаў, сацыяльных паталогій.

Нашымі пісьменнікамі глыбока асэнсаваны драматызм і трагізм нацыянальнай гісторыі, трагізм нацыянальнага быцця, крызіснае самапачуванне асобы. Сітуацыяй памежнага становішча Беларусі абумоўлена тое, што шматлікія войны адбываліся менавіта на нашай тэрыторыі.

М. Гарэцкі ў сваіх творах імкнецца тыпізаваць жыццё беларусаў на працягу значнага адрэзку часу. Адной з праблем роздумаў пісьменніка выступае праблема негатыўнага ўплыву на светаадчуванне чалавека прыгоннага права (аповесць «Камароўская хроніка», кніга «Досвіткі»).

Беларуская літаратура першай трэці ХХ стагоддзя ўздымаецца да ўсведамлення сацыяльна-псіхалагічнага макракосму нацыі ў цэлым, адлюстроўвае нацыянальную ментальную траўму па-за гістарычнасці. Сэнсава-змястоўным для беларускай літаратуры становіцца вобраз «забранага краю», Дому, «раскіданага гнязда». На гістарычных стратах фіксуе ўвагу М. Гарэцкі ў аповесці «Ціхая плынь».

Неспрыяльныя гістарычныя абставіны жыцця нацыі адмоўным чынам адбіваюцца на лёсе асобнага чалавека, прадстаўніка гэтай нацыі. Статус герояў твораў М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага напрамую залежыць ад статусу іх краіны. Беларуская літаратура мае вялікія наробкі ў мастацкім даследаванні негатыўнага антрапалагічнага вопыту. Ключавым матывам айчыннай літаратуры першай трэці ХХ стагоддзя выступае матыў трагізму быцця асобнага чалавека, матыў пакутаў (творы М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага).

Нацыянальнае асэнсоўваецца пісьменнікамі першай трэці ХХ стагоддзя ў непарыўнай сувязі з сацыяльным. Дакладны аналіз сацыяльнага становішча Беларусі пачатку ХХ стагоддзя пададзены ў аповесці М. Гарэцкага «У чым яго крыўда». Узаемазалежнасць сацыяльнага і духоўнага, унутранага – адна з ключавых ідэй аповесці «Ціхая плынь» М. Гарэцкага. Пісьменнік паказвае, як сацыяльныя нястачы прыводзяць да маральнай дэградацыі. На думку М. Гарэцкага, прычыны духоўнага крызісу беларусаў абумоўлены сацыяльнымі прычынамі – беднасцю, непісьменнасцю. Адмоўны ўплыў сацыяльнай безабароннасці на свядомасць чалавека паказваецца ў апавяданнях кнігі

«Досвіткі» («Панская сучка», «Смачны заяц», «Стары прафесар», «Дурны настаўнік», «Сасна» і г.д.). Пісьменнік прыходзіць да высновы, што маральны рост магчымы толькі ва ўмовах сацыяльнай і нацыянальнай свабоды.

Адной з ключавых падзей беларускай гісторыі пачатку XX стагоддзя стала Першая сусветная вайна. М. Гарэцкі асэнсоўвае пытанне ўзаемасувязі нацыянальнага лёсу і ваенных падзей. Пісьменніку належыць самая вялікая ў беларускай літаратуры колькасць твораў, прысвечаных Першай сусветнай вайне: «На імперыялістычнай вайне», «Ціхая плынь», «Жартаўлівы Пісарэвіч», «Літоўскі хутарок», «Рускі», «Генерал», «На этапе». Вызначальны пафас названых твораў М. Гарэцкага – выкрыццё антычалавечай сутнасці вайны. Для М. Гарэцкага вайна – дзея, што не мае ніякай логікі, праціўнік паказаны пісьменнікам таксама як ахвяра, «нявольнік» вайны. У творах М. Гарэцкага адсутнічае ўсялякі ўра-патрыятызм, паколькі беларускі аўтар асэнсоўвае вайну як прадстаўнік нацыі, што ўцягнута ў калаўрот гэтых катастрафічных падзей па-за сваёй волі. Характэрна, што празаік засяроджвае ўвагу не на героіцы змагання, батальных сцэнах. М. Гарэцкі звяртаецца да адлюстравання паводзін і адчуванняў чалавека на вайне (роспач, адчай, бездапаможнасць), апісвае, як і пазней Кузьма Чорны, ахвяр вайны. Магістральным у творах М. Гарэцкага з’яўляецца выяўленне драматызму і трагізму ваенных падзей. Пісьменнік паказвае, як вайна маральна нявечыць чалавека. У апавяданні «Рускі» М. Гарэцкага апісваецца, як навязванне чужых каштоўнасцей, адмаўленне ад традыцыйнай маралі прыводзіць да забойства сабе падобнага. У апавяданні гучыць таксама тэма лёсу прадстаўнікоў так званых «малых» нацый, якія вымушаны гінуць за чужыя інтарэсы.

Думкі і паводзіны герояў М. Гарэцкага выразна кантрастуюць з самім паняццем «вайна». Пісьменнік выяўляе антаганізм паміж светапоглядам свайго героя-селяніна – захавальніка жыцця, сейбіта – і забойствам, жорсткай ваеннай машынай. У аповесці «На імерыялістычнай вайне» гучыць роздум пра нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне беларусаў. М. Гарэцкі як ідэолаг нацыянальнага адраджэння задумваецца, якім чынам паўплывае вайна на лёс беларусаў. Беларуская літаратура выяўляе ўзаемазалежнасць гістарычных падзей і лёсу як асобнага чалавека, сям’і, так і нацыі ў цэлым.

У апавяданнях «Усебеларускі з’езд 1917 года», «У 1920 годзе», «Незадача» М. Гарэцкі аб’ектыўна ўзнаўляе новыя грамадска-палітычныя ўмовы, у якіх апынулася Беларусь. Драматызм разбурэння духоўных асноў нацыянальнага жыцця паказвае М. Гарэцкі ў апавяданнях з кнігі «Люстрадзён». Пісьменнік пераканальна перадае прадчуванне будучай катастрофы адрыву ад каранёў. Трагізм становішча нацыянальнай інтэлігенцыі раскрываецца ў «Скарбах жыцця».

Такім чынам, у творах М. Гарэцкага ўзнаўляецца шэраг самых розных жыццёвых сітуацый, асобасна-псіхалагічных перажыванняў, роздумаў, аднак цэльнасць надае ім адлюстраванне драматычнай хады часу і трагізму лёсу як асобных герояў, так і нацыянальнага лёсу ўвогуле. У асобе М. Гарэцкага беларуская літаратура прапанавала ўласны погляд на час, гісторыю, прапанавала ўласную канцэпцыю часу, што сведчыла пра сталенне нацыянальнай мастацкай традыцыі.

У падраздзеле **5.2.** «**Асэнсаванне Беларускага шляху ў творах Кузьмы Чорнага**» вывучаецца спецыфіка мастацкай гістарыясофіі Кузьмы Чорнага.

Адзначаецца, што Кузьма Чорны ў сваіх творах імкнуўся асэнсаваць найбольш значныя моманты нацыянальнай гісторыі першай паловы ХХ стагоддзя, спасцігнуць вытокі нацыянальна-духоўнай трываласці, жыццястойкасці, усвядоміць аб’ектыўны сэнс гістарычнага працэсу.

Тэма Радзімы, Бацькаўшчыны была скразной тэмай усёй творчасці Кузьмы Чорнага. Вызначальны напрамак пошукаў пісьменніка 1940-х гадоў – асэнсаванне гістарычнага лёсу Беларусі (раманы «Пошукі будучыні», «Млечны Шлях», «Вялікі дзень»). Напружаны роздум над гістарычным лёсам нацыі, яго трагедыйным характарам непазбежна прыводзіць да глыбокіх філасофскіх абагульненняў. Кузьма Чорны не фіксуе асобныя моманты нацыянальнай гісторыі, а імкнецца адшукаць іх інтэгральны змест.

Лёс Беларусі і беларусаў падаецца Кузьмой Чорным як трагічная містэрыя. Геаграфічнае становішча нашай краіны (тэма Беларусі як скрыжавання «Захаду-Усходу» ў творах пісьменніка) паўплывала на тое, што самыя крывавыя войны ХХ стагоддзя прайшлі праз Беларусь. Кузьма Чорны пастаянна гаворыць пра жахі шматлікіх разбурэнняў Першай і Другой сусветных войнаў, рэвалюцый, белапольскай акупацыі. Думка Кузьмы Чорнага скіравана на асэнсаванне ўплыву катастроф (войнаў, рэвалюцый) на ментальнасць, светаадчуванне беларусаў.

Пісьменнік здолеў пераканальна перадаць светаадчуванне асобы ў момант катастрофы, у сітуацыі трагічнага, апакаліптычнага перажывання гісторыі. У празаіка адсутнічаюць апісанні подзвігу, героікі змагання. Кузьма Чорны засяроджваецца на перадачы жахаў, пакутаў, што церпяць людзі на вайне. Героі Кузьмы Чорнага – не воіны, не салдаты. Гэта дзеці, старыя, жанчыны, безабаронныя па вызначэнні, гэта сяляне, чыё прызначэнне – падтрыманне і забеспячэнне жыцця. Адной з ключавых тэм нацыянальнага прыгожага пісьменства выступае тэма бежанства, выгнання (раман «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага, «Жартаўлівы Пісарэвіч» М. Гарэцкага). Матыў выгнання з’яўляецца характаралагічнай прыкметай беларускай літаратуры першай трэці ХХ стагоддзя. Паказальны вобраз новай (ці недабудаванай) хаты ў творах Кузьмы Чорнага

(раманы «Пошукі будучыні», «Вялікі дзень»). Страта дому прыводзіць да быццёвай і светапоглядней катастрофы, дысгармоніі, разглядаецца як паказчык сацыяльнай няўстойлівасці, безабароннасці.

Мастацкая практыка Кузьмы Чорнага, асабліва яго творы 1940-х гадоў, дае падставы сцвярджаць, што беларускі пісьменнік быў знаёмы з поглядамі Фрыдрыха Ніцшэ, прадстаўніка філасофіі жыцця. У творах Кузьмы Чорнага ваенных гадоў гучыць непрыхаваная палеміка з ідэяй «звышчалавека», дакладней, тым натуралістычным і пазітывісцкім разуменнем гэтай ідэі, якім скарысталася фашысцкая ідэалогія. Скразной тэмай беларускай літаратуры 1910–40-х гадоў з’яўляецца тэма адабранага маленства (творы М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага, Змітрака Бядулі).

У падраздзеле **5.3** «**Адлюстраванне літаратурай першай трэці XX стагоддзя сацыяльных катаклізмаў часу**» паказваецца, што беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя выявіла згубныя вынікі парушэння, дэвальвацыі гуманістычных маральных каштоўнасцей. З другога боку, надзённай задачай нацыянальнага прыгожага пісьменства гэтага часу з’яўлялася захаванне і актуалізацыя традыцыйных, выпрабаваных часам этычных норм.

Творы Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага, Лукаша Калюгі дэманструюць глыбокае разуменне пісьменнікамі сацыяльных і светапоглядных катаклізмаў свайго часу.

Міхась Зарэцкі ў рамане «Вязьмо» акцэнтаваў увагу на трагедыі сялянства, якое гвалтам прымушалі ўступаць у калгасы, пісаў пра разрыў пакаленняў, калі дзеці адмаўляліся ад бацькоў. Пісьменнік не толькі выказаў сумненні адносна метадаў правядзення калектывізацыі, але і паказаў, да якіх маральных страт яна прыводзіла.

У апісанні Міхасём Зарэцкім сучаснасці на першы план выходзіць драматызм становішча героя, страх быць абвінавачаным у якіх-небудзь адхіленнях ад партыйнай лініі. Празаік адлюстроўвае трансфармацыю жыцця на этычным узроўні. Такім чынам, беларуская літаратура ў асобе Міхася Зарэцкага адгукаецца на скразны для еўрапейскай літаратуры канфлікт – супрацьстаянне ўплыву разбуральных ідэалогій, сутнаснай прыкметай якіх быў, па словах А. Камю, «маральны нігілізм».

Якуб Колас у аповесці «Адшчапенец», як і Міхась Зарэцкі, паказвае дэфармацыю маралі, тое, як ідэі класавай варожасці вынішчаюць лепшае ў чалавеку.

Шмат непрыхаваных выпадаў супраць новых парадкаў прасочваецца ў творах Кузьмы Чорнага (апавяданні «Трагедыя майго настаўніка» «Справа Віктара Лукашэвіча», «Макаркавых Волька»). Лукаш Калюга ў рамане

«Пустадомкі» піша пра трагічны час 1930-х гадоў, людзей «кручаных дзён», якія не па сваёй волі сталі пустадомкамі, бесхацінцамі. Беларуская літаратура 1920-30-х гадоў пераканальна апісвае страту маральных арыенціраў. Міхась Зарэцкі ўзнаўляе «новыя» норавы, працэс разбурэння сям'і (апавяданні «Бель», «Дзіўная»). Новая мараль, філасофія «свабоднага кахання» прыходзіла ў супярэчнасць з традыцыйнымі этычнымі каштоўнасцямі.

Такім чынам, беларуская літаратура 1930-х гадоў адлюстроўвае драматычны антрапалагічны вопыт нацыі, паказвае небяспеку разбурэння традыцыйнай этыкі, духоўнасці.

У раздзеле 6 асэнсоўваецца «**Канцэпцыя чалавека ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя**». Адзначаецца, што праблема мастацкай канцэпцыі чалавека з'яўляецца адной з ключавых у літаратуразнаўстве. Мастацкі вобраз чалавека ў літаратаразнаўстве разглядаецца як абумоўлены гістарычным часам, так і светапоглядам пісьменніка, літаратурнай традыцыяй, нацыянальнымі маральнымі ўстаноўкамі.

Канцэпцыя чалавека дазваляе акрэсліць і асэнсаваць этычныя прыярытэты нацыянальнага прыгожага пісьменства, прааналізаваць спецыфіку мастацкага мыслення аўтара, а таксама даследаваць духоўную, эстэтычную адметнасць пэўнай культурна-гістарычнай эпохі. Цэласнае асэнсаванне канцэпцыі чалавека эпохі 1920-30-х гадоў дазваляе прасачыць філасофска-этычную трансфармацыю свядомасці.

Найбольш распрацаванай з'яўляецца канцэпцыя чалавека ў творах Кузьмы Чорнага. Апавяданні празаіка са зборнікаў «Пачуцці», «Хвоі гавораць» сталі этапнымі для беларускай прозы ў напрамку ўзмацнення яе філасофскага, інтэлектуальнага гучання. Пісьменнік бярэцца за асэнсаванне так званых вечных праблем: сутнасці чалавека, узаемаадносін паміж людзьмі і інш. Зварот да падобнай праблематыкі сведчыў пра пасталенне беларускай мастацкай думкі, пра глыбіню, значнасць пошукаў Кузьмы Чорнага.

Празаік сцвярджаў каштоўнасць чалавека ў філасофскім, светапоглядным, псіхалагічным аспектах. Кузьма Чорны адлюстроўвае працэс дэфармацыі (вобраз Абрама, раман «Сястра») такіх традыцыйных маральных парадыгмаў, як Дабро і Зло. Такім чынам, на дыскрэдытацыю асобы беларускае пісьменства адказала апалогіяй чалавека, сцвярджэннем чалавечнасці, спачування, зваротам да гуманных інтэнцый асобы.

Своеасаблівай рэакцыяй на той прагматызм, утылітарны погляд на чалавека, што пачаў набіраць сілу ў грамадстве, быў зварот Кузьмы Чорнага да перадачы складанай гамы чалавечых настрояў, адчуванняў, жаданняў, што абумовіла спецыфіку стылёвых, наратыўных стратэгій аўтара.

Пісьменнік лічыў, што да чалавека нельга падыходзіць з адназначнымі меркамі і схемамі, успрымаць толькі як сродак для выканання пэўных задач. Можна нагадаць, што і інтуітывізм, адчувальны ў творах Кузьмы Чорнага гэтага часу, – своеасаблівае адмаўленне пазітывісцкага дагматызму, зададзенасці, утылітарнага погляду на чалавека.

Палемічным у адносінах да павярхоўна-спрошчанага разумення чалавека з'яўляецца сам прынцып пабудовы рамана «Сястра» – скрупулёзны аналіз думак, паводзін, учынкаў персанажаў, паглыбленне ў іх унутраны свет, што ўжо само па сабе сведчыць аб значнасці, каштоўнасці асобы чалавека. Празаік спрабуе перадаць не толькі ўстойлівыя, выразна акрэсленыя пачуцці і жаданні, але і звяртаецца да сферы падсвядомага. Імкненне да выяўлення новых граней чалавечай псіхалогіі падштурхоўвала да пошуку адпаведных прынцыпаў і прыёмаў пісьма.

Творчасць Кузьмы Чорнага супала з агульнай тэндэнцыяй у развіцці літаратуры – абнаўленнем тэхнічнага арсеналу, зменамі ў прынцыпах стварэння вобраза. Апошні будуецца шляхам разлажэння прадметаў, з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці на асобныя ўражанні, адчуванні, перажыванні. «Дамінантай у стварэнні вобраза», па словах М. Бахціна, выступае самасвядомасць героя. Пісьменнік звяртаецца да перадачы самых тонкіх, ледзь улоўных, няўстоўлівых чалавечых пачуццяў, пераменлівых настрояў. Выключная ўвага надаецца феномену памяці, якая ўспрымаецца як своеасаблівы масіў, сховішча чалавечага мінулага. Самакаштоўным прадметам мастацкага выяўлення становяцца ўнутраныя перажыванні асобы.

Імкненне нашых творцаў адстояць суверэннасць асобы, псіхолага-антрапалагічны аспект твораў Кузьмы Чорнага, М. Гарэцкага, Міхася Зарэцкага, Лукаша Калюгі з'яўляецца паказчыкам аўтанамізацыі беларускай літаратуры.

Гуманістычны пафас твораў Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага, беларускай літаратуры ў цэлым сведчыць не толькі пра этычны аспект творчасці асобнага пісьменніка. Ён выяўляе ментальныя асновы нацыі, а таксама ўзыходзіць да сацыяльных праблем тагачаснага грамадства. Наша літаратура працягвала сцвярджаць нязменныя гуманістычныя каштоўнасці, выявіла ўстойлівасць асноў нацыянальнай мастацкай анталогіі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Нацыянальнае ў літаратуры мае разнастайныя формы рэалізацыі. Носьбітам нацыянальнага выступае як герой твора, так і сам аўтар, які мае спецыфічную нацыянальную прыроду, дэтэрмінаваны ёю. Пры вывучэнні нацыянальнага праз прызму мастацкай літаратуры разглядаюцца такія ўзаемазвязаныя паняцці, як нацыянальны характар, нацыянальны менталітэт, нацыянальная канцэптасфера, нацыянальная ідэя. Даследаванне нацыянальнага як феномена экзістэнцыйнага абумоўлівае зварот да асэнсавання інтэнцыянальна-светапогляднага зместу мастацкага твора, яго праблемнага, аксіялагічнага, эстэтычнага патэнцыялу. Нацыянальная самабытнасць выяўляецца праз характар успрымання прасторы і часу, погляды на жыццё і смерць, стаўленне да прыроды, да звышпрыроднага, праз асаблівасці мыслення, псіхічныя рэакцыі. Спецыфіку асобнай нацыянальнай літаратуры як цэласнага феномена вызначае таксама сістэма ўстойлівых матываў, міфалагем, архетыпаў. Нацыянальная адметнасць літаратуры выяўляецца праз такія мастацкія сродкі, як нацыянальная топіка, сімвалы, дэталі. Асноўнымі ідэнтыфікацыйнымі маркерамі нацыянальнага ў мастацкай літаратуры выступаюць нацыянальныя абрады і звычаі, фальклор, традыцыі, этнаграфічныя адзнакі, мова, постаці гістарычных і культурных дзеячаў, гістарычныя падзеі, ландшафт. Важным фактарам нацыянальнай ідэнтычнасці з'яўляецца сістэма рэлігійных поглядаў, а таксама сацыяльная дыферэнцыяцыя нацыянальнага. Мастацкія вобразы, якія ўвасабляюць нацыянальна-культурную спецыфіку, у творах асобных аўтараў могуць выступаць як дамінантнымі, так і перыферыйнымі, а ўніверсальныя матывы набываюць нацыянальна-культурныя канатацыі [1, 2, 3, 12, 20, 30, 37, 49, 58, 61, 65, 67].

2. Актыўны працэс асэнсавання і вербалізацыі галоўных прыкмет нацыянальнага навукова-тэарэтычнай і публіцыстычнай думкай прыпадае на пачатак ХХ стагоддзя. Асновы нацыянальнага самаўсведамлення закладваліся нашаніўскімі пісьменнікамі-адраджэнцамі. Дзякуючы намаганням В. Ластоўскага, А. Луцкевіча, М. Багдановіча і іншых беларускае перастае атаясамлівацца выключна з этнічнай сферай і пачынае выступаць полем для культурнага самавызначэння. Асноўныя інтэнцыі дзеячаў нацыянальнага адраджэння накіраваны на сцвярджэнне самабытнасці беларускай нацыі, яе тэрытарыяльнай укарэненасці, выхаванне новага вобраза беларуса, суб'екта гісторыі, абуджэнне гістарычнай памяці, далучэнне народа да вопыту нацыянальнай гісторыі, да нацыянальнай кансалідацыі. Сцвярджаецца тэзіс пра велічнае мінулае Беларусі, высокі ўзровень развіцця беларускай культуры, ствараецца міф паходжання, акрэсліваюцца геаграфічныя межы радзімы, выбудоўваецца пантэон беларускіх дзяржаўных і культурных персаналій. Разам з тым беларускае пачатку ХХ стагоддзя атаясамліваецца з ніжэйшымі сацыяльнымі слаямі, афармляецца тэзіс пра сучаснае паняволенае жыццё беларусаў, беларускі народ падаецца як народ-гаротнік. Замацоўваецца канцэпцыя памежнага становішча краю, палажэнне пра поліэтнічны характар Беларусі, беларускую талерантнасць. Сцвярджаецца, што канфесійная прыналежнасць у дачыненні Беларусі не з'яўляецца ідэнтыфікацыйным маркерам, акцэнтуецца ўвага на важнасці паганскага фактару ў фарміраванні нацыянальнага светапогляду беларусаў.

Ключавое месца ў публіцыстыцы пачатку XX стагоддзя займае абарона правоў беларускай мовы. Важнай у дактрыне беларускага выступае эстэтызм мыслення [2, 21, 24, 25, 38, 64, 66, 69, 74].

3. Фарміраванне мастацкага аўтавобраза Беларусі прыпадае на першую трэць XX стагоддзя. Асноўнымі кампанентамі мастацкага аўтавобраза Беларусі гэтага часу з'яўляюцца тэрыторыя, для якой характэрны пэўныя прыродна-ландшафтныя асаблівасці, геаграфічныя межы, топасы радзімы, гістарычныя і культурныя постаці. Беларусь пададзена як краіна шматэтнічная і поліканфесійная. Фарміраванне ўяўленняў пра структуру нацыянальнага «Я» адбываецца ў кантэксце філасафемы «Захад – Усход». Канцэпцыя памежнага становішча Беларусі пададзена і ў мастацкіх творах: «Лабірынты» В. Ластоўскага, «Тутэйшыя» Янкі Купалы, «Лірныя спевы», «Ціхая плынь» М. Гарэцкага, «Трыццаць год», «Пошукі будучыні», «Млечны шлях», «Вялікі дзень» Кузьмы Чорнага.

Афармляецца міф паходжання, міф пра велічнае мінулае Беларусі, міф пакутаў. Мастацкі вобраз беларуса амбівалентны: побач з вобразам беларуса-пакутніка фарміруецца вобраз беларуса як самастойнага і самадастатковага суб'екта гісторыі. Працэс станаўлення беларуса як суб'екта гісторыі адлюстраваны ў творах В. Ластоўскага, Янкі Купалы, М. Гарэцкага, Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага. «Іншымі» ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя выступаюць яўрэі, палякі, татары, немцы (аўстрыйцы), цыгане. «Чужымі» ў творах беларускай прозы 1940-х гадоў паўстаюць носьбіты фашысцкай ідэалогіі (творы Кузьмы Чорнага) [2, 15, 17, 18, 19, 22, 23, 24, 25, 30, 32, 33, 35, 37, 41, 42, 69].

4. У беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя пададзена цэласная мадэль нацыянальнага быцця ў адзінстве духоўнага і матэрыяльнага пачаткаў, асэнсаваны маральна-этычныя прыярытэты нацыянальнага быцця, увасоблены ідэал гарманічнага ўніверсуму. Выяўлены нацыянальна-адметныя погляды беларуса на свет, своеасаблівая філасофія жыцця. У літаратуры ўвасоблены такія рысы нацыянальнага светапогляду, як вітальнасць, жыццёвасць, прывязанасць да «свайго»: сваёй сям'і, зямлі, малой радзімы, нявыхад за межы ўласнай тоеснасці, перавага рацыянальнага над эмацыянальным, талерантнасць, антэізм (параднёнасць з роднай зямлёй), эстэтызм мыслення. У беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя эстэтызуецца кодэкс нацыянальнай этыкі. У канцэпцыі беларускіх пісьменнікаў свая зямля, свой дом складаюць ідэал гарманічнага ўніверсуму. Ідэйна-светапоглядныя ўстаноўкі беларускай літаратуры выразна апелююць да хрысціянскай этыкі і маралі. Філасофія жыцця героя беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя заключаецца ва

ўсведамленні важнасці перш за ўсё быційных каштоўнасцей, успрыманні жыцця як вышэйшай каштоўнасці, разуменні ўніверсальнай значнасці ўсяго існага, рацыянальным стаўленні да Абсалюту, усведамленні зменлівасці, рухомасці свету. Літаратурай адзначаецца моцны ўплыў паганства на светаадчуванне беларусаў [1, 2, 3, 8, 9, 10, 12, 13, 16, 18, 20, 27, 34, 36, 40, 43, 44, 46, 47, 49, 50, 53, 57, 61, 62, 63, 77].

5. У беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя ўвасоблены комплекс устойлівых матываў і вобразаў, якія абумовілі спецыфіку мастацкай сістэмы нашага прыгожага пісьменства і якія выяўляюць адметнасць беларускай культуры як цэласнага феномена. Асноўнымі вобразамі беларускай літаратуры гэтага часу, якія народжаны нацыянальнай гісторыяй, ментальна-псіхалагічным складам нацыі, сацыяльнымі абставінамі, выступаюць вобразы «роднага кута», зямлі, дому, бацькаўшчыны, семантычна звязаныя паміж сабой. Названыя вобразы дазваляюць рэканструяваць нацыянальны вобраз свету ў яго культурна-філасофскай універсальнасці. Вобразы Бацькаўшчыны, зямлі, «роднага кута» падаюцца не толькі як канкрэтная, але і як пачуццёвая, псіхалагічная рэальнасць. «Родны кут» як знакавая этнічная і філасофская рэальнасць беларускага быцця паўстае істотным сэнсавым элементам, праз які раскрываюцца і нацыянальныя этычныя каштоўнасці. Адным з найбольш значных нацыянальна-культурных вобразаў выступае вобраз зямлі, які падаецца і як рэальнае месца пражывання, і як духоўны космас нацыі. Вобраз зямлі як асобнай мастацка-функцыянальнай сістэмы адлюстроўвае як этнічныя, так і гістарычныя рэаліі. Семантычнае развіццё вобраза зямлі ў беларускай літаратуры наступнае: зямля – сям'я – народ – нацыя. Сэнсава-значным для літаратуры пачатку ХХ стагоддзя з'яўляецца вобраз «забранага краю», «раскіданага гнязда».

Часава-прасторавая мадэль нацыянальнага свету, узноўленага ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя, утрымлівае сімволіка-ідэалагічны, аксіялагічны аспект. Мастацкая прастора твораў беларускіх празаікаў першай трэці ХХ стагоддзя, як правіла, лакальная, структураваная і вызначаная. У беларускай літаратуры пададзена так званая «замкнёная» мадэль нацыянальнага свету, дзе, аднак, адбываецца выхад за межы лакальнага да асэнсавання ўніверсальна значных праблем. У лакальным увасабляецца ўсеагульнае [1, 2, 12, 16, 20, 27, 44, 48, 50, 57, 62].

6. Глыбіня і значнасць праблем, якія асэнсаваны беларускай прозай 1910–40-х, сведчыць пра яе гістарыясофскую скіраванасць. У беларускай прозе асэнсоўваюцца найбольш значныя моманты нацыянальнай гісторыі першай паловы ХХ стагоддзя, актуальнейшыя пытанні часу. Беларуская проза імкнецца ўсвядоміць заканамернасці гістарычнага працэсу ўвогуле, аб'ектыўны сэнс

гістарычных падзей першай паловы XX стагоддзя, іх духоўна-маральны аспект. Літаратура імкнецца спасцігнуць вытокі нацыянальна-духоўнай трываласці, жыццястойкасці, сацыяльна-псіхалагічны макракосм нацыі ў цэлым. Сутнаснай адзнакай мастацкай гістарыясофіі беларускай прозы выступае яе нацыясофская скіраванасць. Лёс Беларусі з’яўляецца скразным структурным элементам гістарыясофскага дыскурсу М. Гарэцкага і Кузьмы Чорнага. Робіцца акцэнт на трагічным характары беларускай гісторыі. Літаратура праз лёс асобнага чалавека, сям’і выяўляе драматызм і трагізм гісторыі, трагізм нацыянальнага быцця, крызіснае самапачуванне асобы. Канцэнтраваным выяўленнем нацыянальнай ідэі, увасобленай у беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя, з’яўляецца імкненне жыць на сваёй зямлі і будаваць сваё жыццё у адпаведнасці з іманентна ўласцівымі беларусам прынцыпамі і маральнымі ўстаноўкамі [1, 2, 9, 14, 15, 23, 24, 25, 26, 29, 33, 35, 39, 55, 68, 70, 72, 73, 76, 77].

7. Погляды на чалавека, адлюстраваныя ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя, адпавядаюць нацыянальным этычным устаноўкам. Якуб Колас, Максім Гарэцкі, Кузьма Чорны, Міхась Зарэцкі, Лукаш Калюга паслядоўна сцвярджалі гуманістычныя прыярытэты, адстойвалі ідэю чалавека як непаўторнай індывідуальнасці. На дыскрэдытацыю асобы беларускае пісьменства адказала апалогіяй чалавека, сцвярджэннем чалавечнасці, спачування, зваротам да гуманных інтэнцый асобы. Псіхолага-антрапалагічны аспект твораў Кузьмы Чорнага, М. Гарэцкага, Міхася Зарэцкага, Лукаша Калюгі з’яўляецца сведчаннем аўтанамізацыі беларускай літаратуры. Беларуская літаратура адмаўляла прынцыпы класавага падыходу. У якасці альтэрнатывы беларускае мастацкае слова прапанавала ідэю самакаштоўнасці чалавека, стварыла вобраз дзейснай асобы, здольнай адстойваць свае прынцыпы і перакананні. Пісьменнікі першай трэці XX стагоддзя працягнулі гуманістычныя традыцыі нацыянальнага прыгожага пісьменства. Найбольш поўная і цэласная канцэпцыя чалавека ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя пададзена ў творах Кузьмы Чорнага [1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 11, 28, 31, 45, 51, 54, 56, 59, 71, 75].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання**

Матэрыялы і высновы дысертацыйнага даследавання з’яўляюцца актуальнымі для літаратуразнаўства і сістэмы нацыянальнай адукацыі краіны.

Навуковы патэнцыял работы можа быць запатрабаваны айчыннымі і замежнымі спецыялістамі-літаратуразнаўцамі, а таксама спецыялістамі сумежных навук – філосафамі, культуролагамі, псіхолагамі.

Вынікі работы могуць быць выкарыстаны пры далейшым комплексным вывучэнні гісторыі беларускай літаратуры, культуры, вывучэнні канцэптуальнага

зместу нацыянальнага прыгожага пісьменства, яго нацыянальнай спецыфікі, асвятленні месца беларускай літаратуры ў славянскім кантэксце, разглядзе гісторыка-літаратурных фактаў, якія маюць істотнае значэнне для стварэння найбольш цэласнай і завершанай карціны літаратурнага працэсу пэўнага перыяду.

Вынікі даследавання будуць запатрабаванымі пры стварэнні новага пакалення падручнікаў і навучальных дапаможнікаў, пры складанні праграм па гісторыі беларускай літаратуры і культуры, у працэсе выкладання названых дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі.

Навуковы змест работы можа быць запатрабаваным пры падрыхтоўцы спецкурсаў і правядзенні семінараў па беларускай літаратуры, пры напісанні дысертацыйных, магістарскіх, дыпломных і курсавых работ, пры чытанні лекцый па беларускай літаратуры і гісторыі культуры.

Вывады і матэрыялы дысертацыйнай работы знайшлі прымяненне ў вучэбнай праграме дысцыпліны «Беларуская літаратура ХХ стагоддзя» [76–А], вучэбнай праграме спецкурса «Творчасць Кузьмы Чорнага» [77–А]. Матэрыялы работы выкарыстоўваюцца пры выкладанні дысцыплін «Гісторыя беларускай літаратуры ХХ – пачатку ХХІ стагоддзяў», «Беларуская літаратура ХХ стагоддзя ў еўрапейскім кантэксце», «Гісторыя беларускага літаратуразнаўства і крытыкі» ва ўстанове адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны» (акт ад 14.02.2017 года аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання прыкладаецца).

На нашу думку, далейшае развіццё гэтага праекта магчыма ў даследаваннях, скіраваных на вывучэнне філасофска-этычнага патэнцыялу беларускай літаратуры, яе нацыянальнай спецыфікі.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Манаграфіі**

1–А. Мельнікава, А. М. Паэтыка твораў Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава ; навук. рэд. І. Ф. Штэйнер. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2008. – 186 с.

2–А. Мельнікава, А. М. Нацыянальна-светапоглядныя каардынаты беларускай літаратуры першай трэці ХХ стагоддзя / А. М. Мельнікава ; навук. рэд. І. Ф. Штэйнер. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2016. – 214 с.

**Зборнікі навуковых артыкулаў саіскальніка**

3–А. Мельнікава, А. М. Літаратура і Час: плыні, тэндэнцыі, постаці : зб. навук. артык. / А. М. Мельнікава. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2011. – 198 с.

**Артыкулы ў выданнях, рэкамендаваных ВАК, і ў замежным друку**

4–А. Мельнікава, А. М. Імпрэсіянізм у творах К.Чорнага 20-х гг. / А. М. Мельнікава // Роднае слова. – 1997. – № 9. – С. 19–34.

5–А. Мельнікава, А. М. Вывучэнне рамана «Сястра» К.Чорнага ў ВНУ / А. М. Мельнікава // Известия Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. (Беларуская літаратура). – 2001. – № 4 (7). – С. 74–77.

6–А. Мельнікава, А. М. Інтуітывісцкія тэндэнцыі ў творчасці Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Роднае слова. – 2001. – № 6. – С. 14–17.

7–А. Мельнікава, А. М. Нараджэнне празаіка (Па старонках апавяданняў К.Чорнага 20-х гг.) / А. М. Мельнікава // Беларуская літаратура. Рэспубл. міжведамасны зборнік. – Вып. 21. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2001. – С. 69–77.

8–А. Мельнікава, А. М. Кнут Гамсун і Кузьма Чорны / А. М. Мельнікава // Известия Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. (Беларуская літаратура). – 2004. – № 5 (26).– С. 81–87.

9–А. Мельнікава, А. М. Рэцэпцыя твораў Кузьмы Чорнага беларускім літаратуразнаўствам і крытыкай / А. М. Мельнікава // Веснік Мазырскага дзярж. педагагічнага ун-та. – 2004. – № 1 (10). – С. 67–71.

10–А. Мельнікава, А.М. Сакралізацыя навакольнага асяроддзя ў творах Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Известия Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2006.– № 1 (34). – С.49–54.

11–А. Мельнікава, А. М. Станаўленне жанру філасофскай прозы ў беларускай літаратуры першай трэці ХХ ст. / А. М. Мельнікава // Известия Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2008. – № 6 (51). – С. 133–138.

12–А. Мельнікава, А. М. Этнакультурнае ў творах Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Актуальні проблеми слов’янської філології : міжвуз. зб. наук. ст. ; відп. ред. В. А. Зарва. – Київ : Освіта України, 2008.– Вип. ХІХ : Лінгвістика і літературознавство. – С. 280–286.

13–А. Мельнікава, А. М. Хрысціянская дамінанта твораў Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Веснік Брэсцкага ун-та. Сер. 3. – 2010. – № 2. – С. 25–32.

14–А. Мельнікава, А. М. Лёс нацыі як вызначальная тэма славянскіх літаратур / А. М. Мельнікава // Науковий вісник Миколаївського державного ун-ту імені В. О. Сухомлинського. Сер. «Філологічні наукі» : зб. наук. праць / МДУ ; відп. ред. М. І. Майстренко. – Миколаїв, 2010. – Випуск 31. – С. 60–66.

15–А. Мельнікава, А. М. Фарміраванне аўтавобраза ў беларускай літаратуры першай трэці ХХ ст. / А. М. Мельнікава // Białorutenistyka Białostocka /

Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku; red. H. Twaranowicz. – Białystok, 2011. – Tom 3. – S. 117–126.

16–А. Мельнікава, А. М. Нацыянальна-светапоглядны характар паэзіі Яна Чыквіна / А. М. Мельнікава // Literatury Wschodniosłowiańskie ; red. H. Twaranowicz. – Беласток, 2010. – С. 139 –151.

17–А. Мельнікава, А. М. Вобраз «Іншага» ў творах Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Наукові праці : Науково-методичний журнал. – Вип. 170 : Філологія. Літературознавство / ЧДУ ім. П. Могили. – Миколаїв, 2011. – Т. 158. – С. 47–51.

18–А. Мельнікава, А. М. Праблема нацыянальнай ідэнтычнасці ў творах Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Волинь філологічна: текст і контекст. Імагологічні виміри національної літератури : зб. наук. праць / Волинський національний ун-т імені Лесі Українки. – Луцьк, 2011. – Випуск 12. – С. 113–121.

19–А. Мельнікава, А. М. Праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці ў беларускай літаратуры першай трэці ХХ ст. / А. М. Мельнікава // Актуальні проблеми слов’янської філології. Сер. Лінгвістика і літературознавство : міжвуз. зб. наук. ст. / БДПУ ; гол. ред. В. А. Зарва. – Бердянськ, 2012. – Вип. XXV. – С. 50–59.

20–А. Мельнікава, А. М. Нацыянальная спецыфіка беларускай літаратуры і яе вывучэнне літаратуразнаўствам / А. М. Мельнікава // Studia Białorutenistyczne ; red. M. Korzeniowski, S. Kowalow, M. Sajewicz / Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej. – Lublin, 2012. – № 6. – С. 113–124.

21–А. Мельнікава, А. М. Праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці ў публіцыстыцы Вацлава Ластоўскага / А. М. Мельнікава // Acta Albaruthenica ; red. nauk. M. Timoszuk, M. Chaustowich. – Warszawa, 2012. – Tom 12. – С. 75–90.

22–А. Мельнікава, А. М. Вобраз «Іншага» ў творах Максіма Гарэцкага / А. М. Мельнікава // Науковий вісник Східноєвропейського національного ун-ту ім. Лесі Украінки. Сер. Філологічні науки. – 2013. – № 13 (262). – С. 71–76.

23–А. Мельнікава, А. М. Праблема лёсу беларускай нацыі ў творах Максіма Гарэцкага / А. М. Мельнікава // Известия Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. Гуманитарные науки. – 2014. – № 1 (82). – С.103–107.

24–А. Мельнікава, А. М. Сітуацыя культурнага памежжа ў творах Вацлава Ластоўскага / А. М. Мельнікава // Вісник Львівського ун-ту. Сер. Філологічна / Львівський національний ун-т імені Івана Франка. – Вип. 60. – Ч. 1. – Львів, 2014. – С. 150–157.

25–А. Мельнікава, А. М. Праблема «Захад – Усход» у беларускай публіцыстыцы і мастацкай літаратуры першай трэці ХХ стагоддзя / А. М. Мельнікава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – 2015. – № 10. – С. 8–12.

26–А. Мельнікава, А. М. «Праўда часу» ў творах беларускіх пісьменнікаў 1930-х гадоў / А. М. Мельнікава // Białorutenistyka Białostocka / Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku ; red. H. Twaranowicz. – Том 7. – Białystok, 2015. – С. 203–214.

**Артыкулы ў навуковых зборніках**

27–А. Мельнікава, А. М. Праблема зямлі ў творах польскіх, беларускіх, літоўскіх і латышскіх пісьменнікаў / А. М. Мельнікава // Dziedzictwo przeszłości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-słowiańskich ; pod red. nauk. J. F. Nosowicz / Uniwersytet w Białymstoku, Zakład Bibliotekoznawstwa. – Białystok, 2000. – T. IV. – С.126–130.

28–А. Мельнікава, А. М. Кузьма Чорны і Анры Бергсон / А. М. Мельнікава // Слово и время. Первые научные чтения, посвящённые памяти В. Н. Соболенко : сб. науч. ст. / Гомел. гос. ун-т. ; отв. ред. Л. Л. Ермакова. – Гомель, 2002. – С.105–109.

29–А. Мельнікава, А. М. Феномен Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Слово в культуре : сб. науч. ст. : в 2 ч. – Ч. 2 : Слово и текст в философии, богословии, культурологии. Художественный текст в современном научном знании. Сучасныя напрамкі літаратуразнаўства і фалькларыстыкі / Гомел. гос. ун-т. ; под ред. В. Н. Калмыкова. – Гомель, 2004. – С. 304–309.

30–А. Мельнікава, А. М. Тып прасторы як этнахарактарызуючы фактар / А. М. Мельнікава // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся : зб. навук. арт. / Гомел. гос. ун-т. ; рэд. кал. : А. А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2006. – С. 203–208.

31–А. Мельнікава, А. М. Наватарскія тэндэнцыі ў беларускай літаратуры 20-х гадоў / А. М. Мельнікава // Триада бытия: Слово – Время – Личность : Вторые научные чтения, посвящённые памяти В. Соболенко : сб. научн. ст. / ГГУ им. Ф. Скорины ; редкол.: И. И. Морозова [и др.]. – Гомель, 2006. – С. 140–144.

32–А. Мельнікава, А. М. Станаўленне суб'екта гісторыі (паводле твораў Кузьмы Чорнага) / А. М. Мельнікава // VIII Міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаныя С. Некрашэвічу : зб. навук. арт. : у 2 ч. – Ч. 2. / ГДУ імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: А. А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2007. – С. 216–220.

33–А. Мельнікава, А. М. Асэнсаванне беларускага шляху ў творах Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратуры. Міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаная памяці Івана Навуменкі: зб. навук. арт. / М-ва адук. Рэсп. Беларусь, ГДУ імя Ф. Скарыны, Гомельскі абласны савет дэпут., Гомел. спецыяліз. Слав. біб-ка ; рэдкал. І. Ф. Штэйнер (гал рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2009. – С.263–267.

34–А. Мельнікава, А. М. Тэма міласэрнасці і спачування ў творах Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Христианский гуманизм и его традиции в славянской культуре : сб. научн. ст. – Вып.1 / Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол.: Т. Н. Усольцева (гл. ред.) [и др.]. – Гомель, 2009.– С. 212–217.

35–А. Мельнікава, А. М. Вайна ў асэнсаванні Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Великая Отечественная война в судьбе литературы и культуры: исторической опыт как мировоззренческий и моральный выбор ; ред.-сост. И. Н. Афанасьев и [др.]. – Мозырь : «Белый ветер», 2011. – С. 370–376.

36–А. Мельнікава, А. М. Хрысціянскі складнік беларускай літаратуры / А. М. Мельнікава // Христианский гуманизм и его традиции в славянской культуре» : сб. научн. трудов. – Вып. 3 / Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; редкол.: Т. Н. Усольцева (гл. ред.) [и др.]. – Гомель , 2011. – С. 85– 90.

37–А. Мельнікава, А. М. Праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці ў беларускай культуралогіі / А. М. Мельнікава // Спадчына І. Я. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі РБ, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал. І.Ф. Штэйнер (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2012. – С. 192– 196.

38–А. Мельнікава, А. М. Вывучэнне творчасці Максіма Багдановіча ў еўрапейскім кантэксце / А. М. Мельнікава // Мастацкі свет Максіма Багдановіча: адметнасць, шматграннасць, універсальнасць : зб. навук. арт. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; рэдкал.: В.Д. Старычонак (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 176–180.

39–А. Мельнікава, А. М. Лёс нацыі як дамінантная тэма славянскіх літаратур канца XIX – пачатку XX стагоддзя / А. М. Мельнікава // Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка : XV Міжнародны з’езд славістаў (Мінск, 20–27 жніўня 2013) : даклады беларускай дэлегацыі / Нац. акад. навук Беларусі [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 237–251.

40–А. Мельнікава, А. М. Тэма сям’і і кахання ў творчасці Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // « З роду нашого красного...» Перша професорка Волині : зб. наук. пр. на пошану проф. Л. К. Оляндер / Східноєвроп. нац. ун-т ім. Лесі Українки ; упоряд. М. В. Моклиця, Т.П. Левчук. – Луцьк, 2014. – С. 454–463.

41–А. Мельнікава, А. М. Нацыянальная ідэнтычнасць праз прызму твораў М.Гарэцкага / А. М. Мельнікава // Спадчына І. Я. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі РБ, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал. І. Ф. Штэйнер (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2014. – С. 192–196.

42–А. Мельнікава, А. М. Фарміраванне міфа гісторыі ў беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя / А. М. Мельнікава // Спадчына

І.Я. Навуменкі і актуальныя праблемы літаратуразнаўства : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі РБ, Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал. І. Ф. Штэйнер (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2016. – С. 52–56.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

43–А. Мельнікава, А. М. Быццёвасць як адзнака мастацкага мыслення М. Гарэцкага і К. Чорнага / А. М. Мельнікава // Гарэцкія чытанні : матэрыялы дакл. і паведамл. першых міжнар. [пятых] чытанняў, Мінск, 23–24 крас. 1996 г.) / Аб'яд-не дзярж. літ. музеяў Рэсп. Беларусь, Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Ін-т. літ. імя Я. Купалы Акад. навук Беларусі, Горац. гіст.-этнагр. музей і інш. ; рэдкал.: У. М.Ліўшыц (адк.рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1997. – С.81– 85.

44–А. Мельнікава, А. М. Раман «Зямля» Кузьмы Чорнага ў кантэксце нацыянальнай мастацкай традыцыі / А. М. Мельнікава // Трэція навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу : матэрыялы навук. канф. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: У. В. Анічэнка [і інш.]. – Гомель, 1997. – С. 97–99.

45–А. Мельнікава, А. М. Творчасць К. Чорнага 20-х гг. у прачытанні А.Адамовіча / А. М. Мельнікава // Алесь Адамовіч і час : матэрыялы Адамовічаўскіх чытанняў, 5 верасня 1997 г. : тэматычны зб. / Ін-т літаратуры імя Я. Купалы ; рэдкал.: Л. Ф. Яўменаў [і інш.]. – Мінск, 1998. – С. 54–57.

46–А. Мельнікава, А. М. Інтуітывізм як адзнака мастацкага мыслення беларусаў / А. М. Мельнікава // Каласавіны : матэрыялы навук. канф. «Каласавіны», Мінск, 1997 / Дзярж. Літ. музей імя Якуба Коласа ; адказн. за вып.: З. М. Камароўская. – Мінск, 1998. – С. 13–16.

47–А. Мельнікава, А. М. К. Чорны і У. Фолкнер / А. М. Мельнікава // Канцэптуальныя пытанні развіцця мовы, літаратуры і мастацтва ў святле адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа : зб. матэрыялаў Рэспубл. навук. канф., Мазыр, 23–24 красавіка 1998 г. / Мазырскі дзярж. Педагагічны ін-т ; рэдкал. Т.М. Казачэнка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мазыр, 1998. – С. 295–298.

48–А. Мельнікава, А. М. Архетып «балота» ў «Палескай хроніцы» І. Мележа / А. М. Мельнікава // Духоўная і культурная спадчына Беларускага Палесся : матэрыялы навуковай канферэнцыі, Гомель, 18–19 верасня 1997 г. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель, 1998. – С. 153 –156.

49–А Мельнікава, А. М. Прырода і нацыянальны характар у творах Якуба Коласа / А. М. Мельнікава // Каласавіны : матэрыялы навуковай канф. «Праблемы рацыянальнага выкарыстання і захавання прыродных ландшафтаў мемарыяльных музейных аб'ектаў», Мінск, 1999 / Дзярж. Літ. музей імя Якуба Коласа ; рэдкал.: З. М. Камароўская [і інш.]. – Мінск, 1999. – С.41–48.

50–А Мельнікава, А.М. Віталістычнае гучанне твораў К.Чорнага 20-х гадоў / А. М. Мельнікава // Скарыназнаўства, кнігазнаўства, літаратуразнаўства : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый», Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г. ; рэдкал.: У. Конан (гал.рэд). – Мінск : «Беларускі кнігазбор», 2001. – С.271–275.

51–А Мельнікава, А. М. Некаторыя пытанні вывучэння курса «Гісторыя беларускай літаратуры 20-х гадоў ў ВНУ» / А. М. Мельнікава // Мова і літаратура ў сярэдняй і вышэйшай школе: Актуальныя праблемы выкладання : матэрыялы рэспубл. навуковай канф., Гродна, 27 красав. 2000 г. / Гродзенскі дзрж. ун-т імя Я. Купалы ; рэд: М. У. Мікуліч. – Гродна, 2000. – С.222 – 225.

52–А Мельнікава, А. М. Літаратурны працэс 20-х гадоў у крытычных выступленнях М.Гарэцкага / А. М. Мельнікава // Гарэцкія чытанні : матэрыялы дакладаў і паведамленняў, Горкі, 18–20 чэрв. 1997 г. / Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры ; склад.Т. П. Аніскавец. – Мінск, 2000. – С.70–76.

53–А Мельнікава, А. М. Чалавек на зямлі : К.Чорны і творы сусветнай літаратуры / А. М. Мельнікава // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., Мінск, 12–14 кастрычніка 1999 г. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. уні-т ; рэдкал.: С. Я. Ганчарова-Грабоўская [і інш.]. – Мінск, 2000. – Ч.1 : Тэарэтычныя праблемы літаратуразнаўства, міфалагічныя матывы і фальклорныя традыцыі ў літаратуры, славянскія літаратуры ад Сярэднявечча да Асветніцтва, беларуская літаратура ў яе ўзаемасувязях з іншымі літаратурамі свету. – С.157–159.

54–А Мельнікава, А. М. Навацыі К.Чорнага ў галіне мастацкай формы / А. М. Мельнікава // Скарына і наш час : матэрыялы II Міжнар. навук. канф., Гомель, 16–17 мая : у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал. : А.А. Станкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2002. – Ч. I. – С. 138–140.

55–А Мельнікава, А. М. Тэма Свабоды ў творах Я.Коласа і К.Чорнага / А. М. Мельнікава // Каласавіны : матэрыялы навук. канф., прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, Мінск, 2003 г. / Дзярж. Літ. музей імя Якуба Коласа ; адказн. за вып.: З. М. Камароўская. – Мінск, 2003. – С. 65–72.

56–А Мельнікава, А. М. «Тут-быццё» паводле К.Чорнага / А. М. Мельнікава // Слово и время : материалы научн. конф., посвящённой 60-летию Н. Н. Воинова, Гомель, 25–26 сентября 2003 г. : в 2 ч. / Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; под общ. ред. Л. Л. Ермаковой, И. И. Морозовой. – Гомель, 2003. – Ч. 1 : Учёный. Организатор. Человек. – С. 155–158.

57–А Мельнікава, А. М. Псіхалагічны аналіз у творах Л. Талстога і К. Чорнага / А. М. Мельнікава // Слово и время : материалы научн. конф.,

посвящённой 60-летию Н. Н. Воинова, Гомель, 25–26 сентября 2003 г. : в 2 ч. / Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины ; под общ. ред. Л. Л. Ермаковой, И. И. Морозовой. – Гомель, 2003. – Ч. 2 : Л. Н.Толстой и проблемы мировой культуры. – С. 57–60.

58–А Мельнікава, А. М. Мастацкі тэкст як фактар нацыянальнага / А. М. Мельнікава // Текст в лингвистической теории и методике преподавания филологических дисциплин : материалы II Межд. научн. конф., Мозырь, 26–27 марта 2003 г. / Мозыр. гос. пед. ун-т ; отв. ред.: С. Б. Кураш. – Мозырь, 2003. – Ч. 2. – С. 168 –170.

59–А Мельнікава, А. М. Феномен памяці ў М. Пруста і К. Чорнага / А. М. Мельнікава // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гомель, 20–21 мая 2004 г. : у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; гал. рэд. : А. А. Станкевіч. – Гомель, 2004. – Ч.1. – С. 238–241.

60–А Мельнікава, А. М. «Узвышша» і сусветны мастацкі вопыт / А. М. Мельнікава // Рэгіянальныя асаблівасці фальклору і літаратуры славянскіх народаў : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гомель, 23–24 красавіка 2004 г. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэд. кал. : І.Ф. Штэйнер (адказн. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2004. – С. 91–97.

61–А Мельнікава, А. М. Тып прасторы ў творах Якуба Коласа / А. М. Мельнікава // «Каласавіны 2006» : матэрыялы навук. канф., Мінск, 3–4 лістапада 2006 г. / Дзярж. Літ. музей імя Якуба Коласа ; адказн. за вып.: З. М. Камароўская. – Мінск, 2007. – С. 98–104.

62–А Мельнікава, А.М. Нацыянальна-светапоглядны характар твораў Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах : матэрыялы міжнар. навук. канф., Гомель, 19–20 верасня 2007 г. : у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: І. Ф. Штэйнер (адказн. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2007. – Ч. 1. – С. 85–89.

63–А Мельнікава, А. М. Жаночыя вобразы ў творах Кузьмы Чорнага / А. М. Мельнікава // Таленавітыя жанчыны Беларусі ў культурнай, навуковай і мастацкай прасторы свету : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мазыр, 24–25 мая 2007 г. / Мазыр. дзярж. пед. ун-т ; адк. рэд.: А.У. Сузько. – Мазыр, 2007. – С. 109–110.

64–А Мельнікава, А. М. З гісторыі развіцця кампаратывістыкі ў Беларусі / А. М. Мельнікава // Діалог слов'янських культур : матеріали Міжн. науково-практичної конф. до Дня слов'янскої писемності та культури, Миколаїв, 23 травня 2008 / МДУ імені В. О.Сухомлинського ; редкол.: О. М. Пєхота [и др.]. – Миколаїв, 2008. – С.115–120.

65–А Мельнікава, А. М. Нацыянальная ідэнтычнасць і літаратура / А. М. Мельнікава // Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах : матэрыялы Міжнар. навук. чытанняў [да 85-годдзя з дня нарджэння І. Навуменкі] / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: І. Ф. Штэйнер (адк. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 2010. – С.171–176.

66–А Мельнікава, А. М. Праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці ў творах Максіма Багдановіча / А. М. Мельнікава // Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэксце сусветнай літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 25– 26 ліст. 2011 г. / Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нац. акадэміі навук Беларусі ; рэдкал.: А. А. Манкевіч [і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 161–165.

67–А Мельнікава, А. М. Мастацкая «кадыфікацыя» нацыянальнага / А. М. Мельнікава // Беларуская і руская літаратуры: тыпалогія ўзаемасувязей і нацыянальнай ідэнтыфікацыі : матэрыялы Міжнар. навуковай канферэнцыі, Мінск, 18–19 красавіка 2012 г. / Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі ; рэдкал.: М. У. Мікулч (адказн. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 192–196.

68–А Мельнікава, А. М. Асэнсаванне траўмы ў беларускай літаратуры 1910-40-х гадоў / А. М. Мельнікава // Творчасць Аркадзя Куляшова ў дыялогу славянскіх літаратур: традыцыі, наватарства, нацыянальная адметнасць : матэрыялы Міжнар. навук-практ. канф., Мінск, 29 студзеня 2014 г. / Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літ. Нац. акадэміі навук Беларусі ; рэдкал.: А. А. Манкевіч [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 240–243.

69–А. Мельнікава, А. М. Нацыянальная ідэнтычнасць праз прызму беларускай літаратуры 1910–40-х гадоў / А. М. Мельнікава // Працоўныя матэрыялы Трэцяга Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі, Каўнас, 11–13 кастрычніка 2013 г. ; старшыня нав. рады А. Казакевіч. – Каўнас, 2014. – С. 487–491.

70–А Мельнікава, А. М. Першая сусветная вайна праз прызму твораў М. Гарэцкага і Кузьмы Чорнага // Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 7–8 кастрычніка 2014 г. / Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2014. – С. 155–159.

71–А. Мельнікава, А. М. Мастацкія пошукі беларускай прозы 1920-х гадоў і еўрапейскі кантэкст / А. М. Мельнікава // Працоўныя матэрыялы Чацвёртага Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі, Каўнас, 11–13 кастрычніка 2014 г. ; старшыня нав. рады А. Казакевіч. – Каўнас, 2015. – С. 177–181.

72–А Мельнікава, А. М. Мастацкая гістарыясофія М.Гарэцкага / А. М. Мельнікава // Вечны рух жыцця і заканамернасці творчых пошукаў

літаратуры : мат. Рэсп. навукова-практ. канф (да 90-годдзя з дня нараджэння І. Я. Навуменкі), Мінск, 26–27 лютага 2015 г. / Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі ; А. А. Манкевіч [і інш.]. – Мінск, 2015. – С. 264–269.

73–А Мельнікава, А. М. Война сквозь призму произведений Кузьмы Чорного / А. М. Мельнікава // Запечатленная Победа: ключевые образы, концепты, идеологемы : материалы Междунар. Конф., посвящённой 70-летию окончания Второй мировой войны / Институт русской литературы РАН (Пушкинский Дом), Воронежский университет. – СПб, 2015. – С. 101–103.

74–А Мельнікава, А. М. Канцэптуалізацыя нацыянальнага ў беларускай крытыцы і публіцыстыцы першай трэці ХХ стагоддзя / А. М. Мельнікава // Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 3–4 сакавіка 2016 г. / Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літ. НАН Беларусі ; рэдкал.: А. А. Манкевіч [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 75–78.

**Курсы лекцый, вучэбныя дапаможнікі, праграмы**

75–А. Мельнікава, А.М. Беларуская літаратура ХХ ст. ў еўрапейскім кантэксце : курс лекцый / А. М. Мельнікава. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2007. – 126 с.

76–А. Мельнікава, А. М. Беларуская літаратура ХХ ст. : вучэбная праграма курса / А. М. Мельнікава. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2004. – 26 с.

77–А. Мельнікава, А. М. Творчасць Кузьмы Чорнага : вучэбная праграма спецкурса / А. М. Мельнікава. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2004. – 26 с.

# РЭЗЮМЭ

## Мельнікава Анжэла Мікалаеўна

## Канцэптуалізацыя нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя

**Ключавыя словы:** нацыянальны светапогляд, беларуская літаратура, канцэпт, архетып, аўтавобраз, гетэравобраз, аксіялогія, этыка, культурны код, суб’ект гісторыі, гістарыясофія, канцэпцыя чалавека.

**Мэта даследавання** – цэласна, сістэмна акрэсліць спецыфіку канцэптуалізацыі нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя: праблему нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, асаблівасці мастацкага асэнсавання ключавых пытанняў тут-быцця нацыі, нацыянальную адметнасць ідэйных і этычных асноў творчасці беларускіх пісьменнікаў, спецыфіку нацыянальнага менталітэту, канцэпцыю нацыянальнага шляху, сфармуляваную ў мастацкіх, публіцыстычных, крытычных тэкстах.

**Метады даследавання.** Найбольш аптымальным для нашага даследавання з’яўляецца комплексны падыход, выкарыстанне розных метадалагічных стратэгій*:* культурна-гістарычнага, параўнальна-гістарычнага, рэцэптыўнага, структурна-семантычнага метадаў.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** На аснове цэласнага культуралагічнага аналізу мастацкіх і літаратурна-крытычных тэкстаў упершыню комплексна, сістэмна акрэслена спецыфіка канцэптуалізацыі нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя: разгледжаны напрамкі асэнсавання нацыянальнага навукова-тэарэтычнай і публіцыстычнай думкай; цэласна ахарактарызавана мастацкая мадэль нацыянальнага быцця ў беларускай прозе першай трэці ХХ стагоддзя; асэнсавана спецыфіка мастацкага засваення нацыянальнага светапогляду; разгледжаны гістарыясофскія асновы творчасці беларускіх пісьменнікаў акрэсленага перыяду; сістэмна даследавана канцэпцыя чалавека і мастацкая спецыфіка яе рэалізацыі.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Матэрыялы і вывады могуць быць выкарыстаны пры далейшым фундаментальным вывучэнні гісторыі беларускай літаратуры, культуры, пры стварэнні новага пакалення падручнікаў.

**Сфера прымянення.** Літаратуразнаўства, культуралогія.

# РЕЗЮМЕ

## Мельникова Анжела Николаевна

## Концептуализация национального в белорусской прозе первой трети XX столетия

**Ключевые слова:** белорусская литература, национальное мировоззрение, концепт, архетип, автообраз, гетерообраз, аксиология, этика, культурный код, субъект истории, историософия, концепция человека.

**Цель исследования** – целостно, системно охарактеризовать специфику концептуализации национального в белорусской прозе первой трети XX столетия: проблему национальной самоидентификации, особенности художественного осмысления ключевых вопросов здесь-бытия нации, национальную специфику идейных и этических основ творчества белорусских писателей, специфику национального менталитета, концепцию национального пути, сформулированных в художественных, публицистических, критических текстах.

**Методы исследования.** Наиболее оптимальным для нашего исследования является комплексный подход, использование различных методологических стратегий: культурно-исторического, сравнительно-исторического, структурно-семантического, рецептивного методов.

**Полученные результаты и их новизна.** На основе целостного культурологического анализа художественных и литературно-критических текстов впервые комплексно, системно очерчена специфика концептуализации национального в белорусской прозе первой трети XX века: рассмотрены направления осмысления национального научно-теоретической и публицистической мыслью; целостно охарактеризована художественная модель национального бытия в белорусской прозе первой трети XX века; осмыслена специфика художественного освоения национального мировоззрения; рассмотрены историософские основы творчества белорусских писателей обозначенного периода; системно исследована концепция человека и художественная специфика ее реализации.

**Рекомендации по использованию полученных результатов.** Материалы и выводы могут быть использованы при дальнейшем изучении истории белорусской литературы, культуры, при создании нового поколения учебников.

**Сфера применения**. Литературоведение, культурология.

## SUMMARY

**Melnikava Anzhela**

**Conceptualization of the category «national» in the Belarusian prose of the first third of the XX century**

**Key words:** national worldview, Belarusian literature, concept, archetype, autoimage, heteroimage, axiology, ethics, cultural code, the subject of history, historiosophy, the concept of a person.

**The purpose of the study** – holistically, systematically to characterize the specificity of conceptualization of the national in Belarusian prose of the first third of the XX century: the problem of national self-identification, features of artistic interpretation of the key issues here-the existence of the nation, national specificity of the ideological and ethical foundations of creativity of Belarusian writers, the specifics of the national mentality, the concept of the national way in artistic, journalistic, critical texts.

**Research methods.** The use of different methodological strategies: cultural-historical, comparative-historical, structural-semantic, receptive methods.

**The obtained results and their novelty.** For the first time national worldview specifics of the Belarusian literature of the first third of XX century is defined comprehensively and systematically, it is based on holistic cultural analysis of artistic and literary-critical texts: specify of conceptualization of national scientific-theoretical and publicistic thoughts is considered; the model of national existence in the Belarusian prose of the first third of the XX century is characterized comprehensively; specifics of art development of the national worldview is comprehend; historiosophical bases of creation of Belarusian writers; the concept of man and the artistic specificity of its implementation is studied systematically.

**Recommendations for the use of the results.** Materials and conclusions can be used for further studies of the history of Belarusian literature, culture, creating a new generation of textbooks.

**Scope.** Literary criticism, cultural studies.